ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 47 (1684) | Аўторак, 12 чэрвеня 1962 года | Цана 4 кап.

## У ГЭТЫМ НУМАРЫ

СЛОВА Ў АБАРОНУ МІРУ. ★ ДОБРЫ НАСТРОЙ — ХАРАСТВО ДУШЫ. ★ ВОПЫТ ПІНСКІХ ЭНТУЗІЯСТАЎ. ★ ЧЭРВЕНЬСКІЯ НУМАРЫ ЧАСОПІСАЎ. ★ СУЧАСНЫЯ БЫТАВЫЯ І АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ. ★ ДУМКІ ПРА ПЕРШУЮ КНІГУ ПАЭТА. ★ НАТАТКІ АБ ХРЭСТАМАТЫІ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ. ★ СТО ГОД «МУЖЫЦКАЙ ПРАЎДЗЕ». ★ ВЕРШЫ ГРУЗІНСКАГА ПАЭТА Д. КВІЦАРЫДЗЕ. ★ ДА 25-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ МАТЭ ЗАЛКА. ★ У НАШЫХ СЯБРОЎ.

Будаўнік... Колькі ў яго працы хараства, паэзіі, дыхання мірнага стваральнага жыцця! Любіць сваю прафесію, ганарыцца ёю Вера Жывалеўская. Ганарыцца яна і сваёй брыгадай, адной з лепшых на будаўніцтве Гродзенскага азотна-тукавага камбіната, якой прысвоена званне камуністычнай працы.

Фота В. ВОЛГІНА.

## СЭРЦАМ І ПЕСНЯЙ СВАЁЙ ПРАТЭСТУЮ

**Р. ШЫРМА,**
**народны артыст СССР**

Я праходжу кожнай раніцай па светлых праспектах роднага горада, углядаюся ў твары тых, хто таксама спяшаецца на работу, і думаю: як гэта добра, калі зямля дыхае мірам, якое гэта шчасце для ўсіх нас! А часам з людскіх твараў я пераводжу позірк на неба. Што б ні абяцала яно сёння людзям — сонца ці дождж — я ведаю: усё роўна дасціпныя хлапчукі запусцяць у вышыню рознакаляровыя паветраныя шары, і галубы будуць лётаць пад мірным небам майго горада. І будзе гучаць песня...

У нашым небе — паветраныя шары хлапчукоў, касмічныя караблі. А там, за акіянам, неба ўзварушылі чорныя грыбы атамных выбухаў. У нас слова «космас» абяцае людзям раскрыццё самай загадкавай таямніцы, абяцае падарожжа ў цудоўны нязведаны край. А на мове амерыканскіх заправілаў Пентагона слова «космас» гучыць як ваенны тэрмін, як новая база, новы плацдарм для будучых наступальных баёў.

Вось чаму ў той дзень, калі я прачытаў у газеце заяву-пратэст Савецкага ўрада супраць ядзерных выпрабаванняў у космасе, на рэпетыцыі нашага хору мне здалося, што нават песні нашы загучалі не так, як заўсёды. Быццам новая нота — нота пратэсту ўліпася ў іх. Так, гэта праўда — і песнямі нашымі аб міры і каханні, аб вясновых ручаях і водары сасновага бору, і сэцоцам сваім мы горача пратэстуем. Пратэстуюць мільёны людзей добрай волі планеты Зямля. Нехай слова космас, так гаворым мы, будзе заўсёды сінонімам слову мір. Іншага дапусціць нельга.

Ядзерныя выбухі ў космасе — паскораная падрыхтоўка да новай, страшэннай, спусташальнай вайны, якая прынясе пагібель сотням мільёнаў людзей. Амерыканскіх маньякаў мала цікавіць гэта, як не цікавіць іх і тое, што выпрабаванні ў космасе — гэта цяпер, у мірны час, найвялікшая небяспека для чалавецтва, яны парушаюць фізічныя законы Сусвету, перашкаджаюць людзям вывучаць іх.

Імперыялістаў цікавіць толькі бізнес. Кенедзі чытае ханжаскія малітвы госпаду богу, а сам б'е паклоны жоўтаму д'яблу, клапоціцца пра даходы ракфэлераў, дзілонаў, морганаў і іншых мільярдэраў. Ён усё робіць для таго, каб фінансавыя заправілы тужэй набілі сваё кішэні на гонцы ўзбраенняў. Вось чаму ён баіцца мірнага суіснавання з краінамі сацыялізма, вось чаму не жадае падтрымліваць нашы прапановы аб забароне на векі-вечныя ядзерная зброі.

Мы вельмі паважаем таленавітых і працавітых амерыканскі народ, хочам дружыць з гэтым народам. Прапаганда вайны караецца ў нас па закону як крымінальнае злачынства. Мы любім мір, мірную працу, мы хочам дружбы з усімі народамі свету.

Супраць амерыканскіх ядзерных выпрабаванняў у космасе пратэстуюць вучоныя ўсяго свету, у тым ліку і амерыканскія. Пратэстуюць палітычныя і культурныя дзеячы, у тым ліку і амерыканскія. Пратэстуюць міралюбівыя народы многіх краін свету, у тым ліку і амерыканскі народ.

Але гучней за ўсіх чуваць голас самага міралюбівага ў свеце савецкага народа. Заява нашага ўрада супраць амерыканскіх ядзерных выпрабаванняў у космасе з абурэннем асуджае амерыканскія правакацыі і папярэджвае ўрад ЗША, што на яго ляжа ўся адказнасць за пагаршэнне міжнароднага становішча, за магчымыя вынікі, выкліканыя ваеннай падрыхтоўкай навокал зямной прасторы.

Да заявы нашага ўрада далучаем свой голас і мы, працаўнікі культуры і мастацтва Беларускай рэспублікі. Мы адабраем і падтрымліваем яе.

## ДОБРАГА ВАМ НАСТРОЮ!

— Што? Настрой?

Я бачу, як іншы чытач здзіўлена ўзніме бровы і пацісне плячыма: «Як я працую, як трымаю сябе на людзях, урэшце, як стаўлюся да дзяцей і жонкі — калі ласка, цікаўцеся, пішыце... А мой настрой? Выбачайце, гэта нікога не датычыць. Гэта мая глыбока асабістая справа...»

Ці сапраўды так?

А ці ведаеце вы, як адзін паўлітровы слоік сунічнага варэння сапсаваў настрой пяцікласнікам? Не?.. Паслухайце, гэта цікава.

Да Віктара К., начальніка цэха аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў, прыехаў у госці яго бацька, чалавек пажылога веку і, як кожны,—са сваімі вартасцямі і слабасцямі. Адна з яго «слабасцей» — любоў да салодкага.

Увечары, калі селі піць чай, стары, задаволена паціраючы рукі, прагаварыў:

— Эх, добра было б цяпер сунічак!

Віктар, не доўга думаючы, палез у шафу дастаць слоік варэння. Але жонка даволі бессаромна асадзіла яго:

— Не чапай! Гэта для дзіцяці.

Светлы настрой быў у момант засмучаны.

Стары пакрыўдзіўся, а Віктар, пасварыўшыся з жонкаю, у самым дрэнным настроі пайшоў на работу.

Рабочыя адразу заўважылі, што іх начальнік паводзіць сябе не так як заўсёды: чапляецца, крычыць без патрэбы, а аднаму маладому майстру нават кінуў:

— І чаму вас, ёлупаў, вучаць у інстытуце?..

Настрой у майстра быў канчаткова сапсаваны.

Прыйшоўшы раніцаю дадому і застаўшы жонку ў пасцелі, майстар раскрычаўся:

— Чаму чай не гатовы? «Укалваеш» усю ноч, як ішак, а прыйдзеш дадому—дулю!.. Пані яшчэ ў пасцелі!

Ніякія довады жонкі не памаглі: яна лягла спаць а другой гадзіне — рыхтавалася да ўрокаў (яна настаўніца), сынок неспакойна спаў — давялося да яго некалькі разоў уставаць...

І настрой настаўніцы таксама быў сапсаваны.

З ім яна і прыйшла ў школу — да вучняў пятых класаў. Рэзкі вокрык, знарок зададзеныя пытанні, каб абавязкова «злавіць», і ў выніку — дзесяткі незаслужаных «двоек» і яшчэ больш горкіх слёз, выкліканых несправядлівасцю чалавека, які быў не ў настроі...

Вось так дрэнны настрой перадаўся, як ланцуговая рэакцыя, ад аднаго чалавека да другога і прынёс з сабою шмат непрыемнага многім людзям.

Ці можна пасля гэтага сцвярджаць, што настрой — гэта нешта глыбока асабістае і нікога не датычыць?

Ці хацеў Віктар К. пакрыўдзіць пяцікласнікаў, якіх ён ніколі нават у вочы не бачыў?

Прачытаўшы гэты артыкул, Віктар можа сказаць: «Калі б я ведаў...» Безумоўна, ён не ведаў. Але ён павінен быў ведаць і, вядома, ведаў, што сваёю грубасцю крыўдзіць малодога майстра. І не меў права гэтага рабіць!

Ці мела права настаўніца ўваходзіць у клас з такім настроем?

Лепшыя настаўнікі, памятаючы, што на іх глядзяць сотні вачэй, што ў класах — сотні дзіцячых цікаўных і ўражлівых душ, узялі сабе за абавязковае правіла: «Уваходзіць у клас толькі з усмешкаю!»

І гэтая настаўніца, уваходзячы ў клас, павінна была пераадолець свой мінорны настрой.

Цяжка? Безумоўна!

Але хіба настаўніцы Ганне Ісаеўне лягчэй?

Я сяджу на задняй парце і слухаю мяккі голас гэтай невысокай, спакойнай жанчыны. Выразная дыкцыя. Прыгожая мова. Уважлівыя вочы сямікласнікаў. Відаць, яны паважаюць і любяць сваю настаўніцу. І для іх яна — самая прыгожая, хоць левае вока, больш правільна, месца, дзе было вока, туга перацягнута белай павязкай. Небяспечная хвароба на працягу многіх месяцаў, маскоўскія і ленінградскія клінікі, лепшыя прафесары, але медыцына была бяссільнай: Ганна Ісаеўна вярнулася без вока.

Уважлівая да вучняў, ветлівая да калегаў, Ганна Ісаеўна ніколі не павысіць голасу, заўсёды заступіцца, калі трэба, за таварыша, ніколі не адмовіць у дапамозе таму, хто ў гэтым мае патрэбу.

Я з добрай зайздрасцю гляджу на гэтую мужную жанчыну і ў галаву лезе здраднічая думка: хто-хто, а яна можа сабе дазволіць дрэнны настрой. І, уявіце, не дазваляе!

А калі ўлічыць, што вучоныя, якія працуюць у галіне касмічнай біялогіі, устанавілі, што па нервах чалавека ўзрушэнне перадаецца з хуткасцю 130 метраў у секунду, дык уявіце сабе правадзімасць нерваў у настаўнікаў, выхавацеляў! І якія патрэбны нервы! Але... вашы нервы дзеці не павінны бачыць.

Настаўніца Ш., якая шмат год працуе ў школе, гаворыць:

— Я пасля хваробы стала «псіхам» (так і сказала: «псіхам»!) Крычу на іх, злуюся, шумлю. І заўсёды дрэнны настрой, больш правільна, я стала чалавекам настрою. Адчуваю, што трэба пакінуць школу.

Чалавек настрою... Часта сустракаючыся з ім, мы з жалем, а іншы раз і пагардаю, гаворым: «Нічога не выйдзе. Гэта — чалавек настрою!»

Хто ж ён такі?

Гэта чалавек, у якога хутка мяняецца настрой ад найменшага ўзрушэння, чалавек, які лёгка паддаецца свайму настрою і робіць усё ў адпаведнасці з ім.

Адна настаўніца была ў захапленні ад новага дырэктара. Яна яго хваліла на ўсе лады. І варта было аднойчы дырэктару ў сваім загадзе не адзначыць сярод добрых работнікаў прозвішча гэтай настаўніцы (яна сапраўды добра працавала!), і настрой яе стаў такі прыгнечаны, нібы яна панесла беззваротную страту ці перанесла цяжкую хваробу. Пра гэтую настаўніцу ў калектыве гаворыць: яна—чалавек настрою.

Настрой абумоўліваецца аб'ектыўнымі прычынамі і падпарадкоўваецца аб'ектыўным заканамернасцям. Але хіба гэта выключае неабходнасць валодаць сваім настроем?

Многія пасажыры пятага маршруту тралейбуса, ведаюць кандуктара Раісу Васільеўну Закатаву — выдатнага майстра ствараць добры настрой у людзей. Прыгледзьцеся, як працуе Раіса Васільеўна: ветліва, весела, з жартамі, з прымаўкамі. І так — рэйс за рэйсам. Раніцаю, удзень, увечары. У зімовую завіруху і ў летнюю спякоту. На працягу васьмі год. Большасць пасажыраў, заходзячы ў тралейбус, з ёю вітаюцца, а выходзячы — развітваюцца. Гэта ўбачыш не ў кожным вагоне. Не-не ды і прыслухоўваюцца да вясёлай гаворкі кандуктара мінскія камвольшчыкі, якія едуць са змены, і на стомленых тварах з'яўляюцца ўсмешкі. А хіба Раіса Васільеўне заўсёды весела? Яна пражыла цяжкое жыццё, шмат горкага выпіла з жыццёвай чашы. Раіса Васільеўна гаворыць:

— Не кандуктар добры, а мае пасажыры — малайцы! Галоўнае — гэта добры настрой.

Добры настрой!

Нездарма хтосьці з мудрых сказаў: «Добры настрой — гэта каламазь для жыцця».

Правільна! Без каламазі далёка не паедзеш: калёсы будуць рыпець.

Адна мая знаёмая настаўніца — Сцепаніда Андрэеўна, чалавек энергічны, валявы, неяк расказвала:

— У маіх вучняў былі дзесяткі магчымасцей сапсаваць мне настрой. Але на працягу ўсяго года я на іх ні разу не павысіла голас. Вы ведаеце, многім памагае жарт, а іншы раз — іронія. Вяду ўрок. Бачу: на першай парце, перад маім сталом, Мілавідава, нагнуўшыся да Кудзіна, хуценька расказвае яму шэптам хатняе заданне. А Кудзін слухае на ўсе вушы. Зразумела, не вывучыў. Стала неяк непрыемна і прыкра на душы. Магла на іх накрычаць, але я гэтага не зрабіла. Павярнуўшыся да іх, я спакойна спытала: «Мілавідава, скажыце, калі ласка, вы ўжо адукавалі Кудзіна?» І клас зарагатаў. Гэта было лепшае лякарства для абаіх. І, вядома, для мяне...

Кожны з нас сотні і тысячы разоў адчуваў душэўны ўздым пры добрым настроі: і работа спорыцца, і дабрэйшыя становімся адзін да аднаго, і вочы нашы свецяцца цудоўным агеньчыкам, які міжволі запальвае тых, хто мае з намі сувязь, — і мы прыносім, самі таго не ўсведамляючы, радасць усім навокал. Бо надзеленая радасць — двайная радасць. А мы ж, савецкія людзі, — сябры, браты, таварышы!

Ёсць шмат добрых звычаяў і цудоўных слоў у нашага народа. На ад'езд мы гаворым: «Шчаслівай дарогі!»; калі заходзім, дзе людзі ядуць: «Прыемнага апетыту!»; адыходзячы ўвечары з дому: «Добрай ночы!»

А ці чулі вы калі-небудзь, каб чалавек чалавеку сказаў: «Добрага табе настрою!»

Вы ўсміхаецеся? Але ж гэта не менш важна, чым «прыемнага апетыту!»

Мне ўяўляецца, што ў недалёкай цудоўнай будучыні, дзесьці на шматлюдным аўтарытэтным сходзе ўзнімецца старшыня, сурова насупіўшы бровы, аб'явіць: «Слухаецца справа па абвінавачванню грамадзяніна Пятрова ў тым, што ён сёння, у 10 гадзін 30 мінут сапсаваў настрой таварышу Сідараву...»

Так яно і будзе! Абавязкова!

Мы будзем самае светлае жыццё на зямлі, будуем для сябе, для нашых дзяцей і ўнукаў, а без радаснага, бадзёрага, вясёлага настрою гэтага рабіць нельга.

Дык давайце ж не будзем псаваць адзін аднаму настрой.

Добрага вам настрою, людзі.

**Барыс СОКАЛ**

## Лекцыі аб савецкай маралі

Савецкае раённае аддзяленне Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў беларускай сталіцы арганізавала цыкл лекцый на тэмы «Маральны кодэкс будаўніка камунізма» і «Прыгожае — у жыццё, у быт чалавека».

Сярод лекцый — «Выхаванне новага чалавека — практычная задача камуністычнага будаўніцтва», «Роля савецкай музыкі ў камуністычным выхаванні працоўных», «Роля тэатра ў камуністычным выхаванні», «Задачы савецкага кінамастацтва ў святле рашэнняў XXII з'езда КПСС» і інш.

Увесь цыкл разлічаны на тры месяцы. Чытанне лекцый праходзіць у кінатэатры «Мір».

## У дапамогу кіраўнікам самадзейнасці

Вялікую метадычную работу ў дапамогу мастацкай самадзейнасці праводзіць Мінскі гарадскі Дом народнай творчасці. Для кіраўнікоў тэатральных, харазграфічных, харавых калектываў пачалі працаваць семінары, кансультацыі і творчыя сустрэчы. У семінарскіх занятках прымаюць удзел заслужаны артыст БССР А. Трэпель, заслужаны дзеяч мастацтва БССР Н. Маслаў, заслужаны артыст РСФСР А. Андрэеў і іншыя.

Метадычныя заняткі працягнуцца да ліпеня.

## АДРАС: ПІНСК, гарадскі Дом культуры

З многіх гарадоў і вёсак краіны ў Пінскі гарадскі Дом культуры прыходзяць пісьмы. Аўтары іх—культасветработнікі. Пішуць людзі, кроўна зацікаўленыя ў тым, каб сродкамі культасветработы памагчы партыі ў здзяйсненні велічных планаў пабудовы камунізма.

Пішуць яны ў Пінск не выпадкова. Просьба да пінчан падзяліцца сваім багатым вопытам—вось лейтматыў гэтых пісем. А вопыт, накоплены ў невялікім гарадку на Палессі энтузіястамі культурна-асветнай работы, сапраўды багаты. Поўныя светлай рамантыкі «пінскія вечары», народжаныя гераікай працы «балі пераможцаў у сацыялістычным спаборніцтве», натхнёны «марш камуністычных брыгад», радасныя «святы нашай вуліцы», задушэўныя гутаркі «ля агеньчыка»... Цяжка, бадай, пералічыць усё тое новае, патрэбнае і цікавае, што знойдзена за апошнія некалькі год людзьмі, якія любяць творчасць.

Вось ужо некалькі месяцаў на базе Пінскага гарадскога Дома культуры працуюць курсы-практыкум павышэння кваліфікацыі клубных работнікаў Брэсцкай вобласці.

Чым кіраваўся дырэктар Дома культуры заслужаны дзеяч культуры БССР І. Сакольскі, арганізатар і кіраўнік курсаў, якія працуюць, дарэчы, на грамадскіх пачатках?

— Культасветработнікі, — расказвае ён,— прыязджалі да нас і раней. Мы праводзілі аднадзённыя семінары, чыталі даклады. І, вічыра кажучы, самі заставаліся незадаволенымі. Адчувалася, што ў дакладзе, няхай самым змястоўным, не раскажаш пра ўсё, што трэба ведаць і ўмець культасветработніку. Патрэбна нешта іншае, новае. Так нарадзілася думка аб стварэнні абласных курсаў. У лістападзе мінулага года Пінскі Дом культуры прыняў першую групу курсантаў. Цэлы месяц яны вывучалі гаспадарамі Дома культуры, вывучалі вопыт яго работы, дзейнасць, прымалі ўдзел ва ўсіх яго пачынаннях, перажываючы і радасць поспехаў і няўдачы. Аддавалася вялікая ўвага не толькі да падбору тэматыкі лекцый з улікам запатрабаванняў насельніцтва, але і да арганізацыі слухачоў.

Слухачы курсаў прынялі ўдзел у складанні сцэнарыя чарговага «балю пераможцаў», у афармленні і правядзенні яго, цікавячыся кожнаю дэталлю рабочага свята, пачынаючы з вырабу нагруднай эмблемы і да развітальнага марша пры закрыцці вечара.

Прынялі курсанты актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні «марша камуністычных брыгад», папярэдне добра ўявіўшы яго ідэю—перадача працоўнага і жыццёвага вопыту разведчыкаў будучыні.

Шырокая і змястоўная праграма курсаў. Бібліятэчная справа, правядзенне канферэнцый чытачоў і дыспутаў, работа гурткоў і музычная грамата, тэхніка фатаграфіі, знаёмства з жывапісам і кінамастацтвам—усё гэта знайшло належнае месца ў праграме. Курсанты становяцца ўдзельнікамі рэпетыцый народнага драматычнага тэатра, ансамбля палескай песні і танца, знаёмяцца з абсталяваннем клубнай сцэны, дэкарацыямі, рэквізітам, бутафорыяй, самі арганізоўваюць канцэрты мастацкай самадзейнасці. Несумненна, усё гэта спатрэбіцца ў іх штодзённай практыцы.

У Пінск прыходзяць пісьмы ад былых курсантаў, цёплыя, задушэўныя вестачкі аб тым, што час, праведзены на курсах, не страчаны марна. З вёскі Мальковічы Ганцавіцкага раёна паведамляюць, што нядаўна там праведзен цікавы вечар на тэму «Кім быць?» і весняны «штапельны баль». Вечары, задуманыя ў свой час на курсах, праводзяцца ў сельскіх клубах Столінскага, Драгічынскага, Камянецкага, Кобрынскага раёнаў.

Цяпер на курсах пры Пінскім Доме культуры навучаецца чацвёрты набор. Агульная думка слухачоў: курсы-практыкум неабходны хоць бы ўжо таму, што многія сельскія культасветработнікі яшчэ не маюць спецыяльнай адукацыі.

Думаецца, ёсць сэнс упраўленням культуры іншых абласцей рэспублікі стварыць падобныя курсы на базе лепшых культасветустаноў, якія сталі б своеасаблівымі школамі перадавога вопыту культасветработы.

**І. АГРАНОЎСКІ,**
**Д. ДУДКО.**

## НОВАЯ РАБОТА КУПАЛАЎЦАЎ

Днямі Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў свой новы спектакль па драме К. Сіманава «Чацвёрты», які выкрывае амерыканскі вобраз жыцця. Рэжысёр спектакля Б. Эрын, мастацкае афармленне заслужанага дзеяча мастацтва БССР А. Грыгар'янца. Музыку да спектакля напісаў М. Карэтнікаў.

У спектаклі заняты народныя артысты БССР Л. Рахленка, С. Бірыла, З. Стома, заслужаныя артысты БССР М. Федароўскі, П. Пекур, Т. Алексеева, В. Краўцоў, М. Яроменка, артысты Г. Талачова, В. Тарасаў, Б. Уладамірскі, Ю. Шумакоў, Г. Арлова і іншыя.

Пасля спектакля адбылася сустрэча артыстаў тэатра з аўтарам п'есы К. Сіманавым.

## *Упершыню ў Волгаградзе*

Сардэчна сустрэлі волгаградцы беларускіх спеваноў і танцораў, якія ўпершыню прыехалі сюды на летнія гастролі. На вакзале адбыўся мітынг, на якім прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый віталі дарагіх гасцей.

Спектаклем «Чарадзейка» адкрыліся гастролі Беларускага тэатра оперы і балета. Паказаны ўжо таксама «Лебядзінае возера» і «Фаўст».

Група артыстаў наведала Волгаградскі трактарны завод імя Дзяржынскага і дала там канцэрт.

Спектаклі тэатра нарыстаюцца поспехам у волгаградцаў.

(Наш кар.).

## СВЯТА БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

У клубе цагельнага завода № 4 па ініцыятыве масавай бібліятэкі № 1 Кастрычніцкага раёна горада Мінска ў нядзелю было наладжана свята беларускай кнігі, прысвечанае 80-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. На сустрэчу з чытачамі прыехалі пісьменнікі П. Пестрак, В. Вітка, Ул. Карпаў, С. Шушкевіч, М. Хведаровіч, А. Астрэйка, А. Махнач, Ул. Мехаў, дырэктар Літаратурнага музея Я. Коласа Д. Міцкевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР А. Слесарэнка. Была праведзена літаратурная віктарына па творах Я. Купалы і Я. Коласа.

Пісьменнік П. Пестрак дае аўтограф.

Фота Ул. КРУКА.

## ЧАСОПІСЫ Ў ЧЭРВЕНІ

### «ПОЛЫМЯ»

Нумар адкрываецца вершаваным нарысам Антона Бялевіча «Запольская чараўніца»—аб знатнай звеншчыкоў Еве Карачан з калгаса «Новае жыццё» Гродзенскай вобласці.

«Дзесяць мінут паэзіі» — так назваў нізку сваіх новых вершаў Васіль Вітка. З твораў мастацкай прозы надрукаваны апавяданне Янкі Скрыгана «Месячная ноч» і заканчэнне рамана Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць».

Да 80-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы ў часопісе змешчаны артыкул Максіма Лужаніна «Шляхам жыцця». Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» — вершы Якуба Коласа, розных гадоў, якія раней не публікаваліся, а таксама аўтабіяграфія беларускага пісьменніка Міхася Зарэцкага.

Надрукаваны ў нумары запіскі былога аператыўнага работніка І. Янушкі, артыкулы Я. Казекі і Р. Шкрабы, у якіх разглядаецца творчы шлях І. Мележа і асабліва падрабязна — яго раман «Людзі на балоце».

У раздзеле «Бібліяграфія» — рэцэнзіі: С. Грахоўскага—на кнігу Я. Хелемскага «Перакладаю вершы таварыша», А. Адамовіча — на зборнік артыкулаў Р. Бярозкіна «Спадарожніца часу» і М. Модзля — на даследаванне Ул. Няфёда «Сучасны беларускі тэатр (1946 — 1959)».

### «МАЛАДОСЦЬ»

У чэрвеньскім нумары часопіса надрукавана аповесць Міколы Ваданосава «Кветкі застаюцца з табою» — з жыцця вясковай моладзі, апавяданні Паўла Ткачова «Мой сябар — Міхась» і Аляксандры Ус «На конкурс прыгажунь».

Змешчаны падборкі вершаў Рамана Тармолы, Еўдакіі Лось, Алеся Булыкі, Анатоля Канапелькі і вершы Рыгора Семашкевіча і Івана Ралько.

80-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы прысвечаны цікавыя ўспаміны Кастуся Пуроўскага «Даўняе, але незабыўнае».

Разнастайныя матэрыялы з жыцця рэспублікі змешчаны ў раздзеле «На арбіту камунізма».

Пра мужнасць і гераізм моладзі ў гады Айчыннай вайны гаворыцца ў артыкуле былога сакратара Чэрыкаўскага падпольнага райкома КПБ Г. Храмовіча «Прыгоды Алёшы-разведчыка».

У раздзеле «Размова аб майстэрстве» друкуецца артыкул Анатоля Сабалеўскага «Драматургія малая — непаладкі вялікія».

Часопіс друкуе рэцэнзіі В. Каваленкі на кнігу апавяданняў і аповесцей Барыса Сачанкі «Барвы ранняй восені», В. Тараса на кнігу вершаў Фёдара Яфімава і Ул. Юрэвіча на кнігу А. Адамовіча «Беларускі раман».

### «БЕЛАРУСЬ»

Нумар адкрываецца артыкулам М. Савіча «Першыя крокі» — аб першых днях работы Слуцкага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення. Змешчаны таксама нарысы В. Праскурава «Працай прыгожы чалавек», «Дзеля шчасця на зямлі» А. Суслава, «Камуніст» П. Шаўцова, гутарка са старшынёй Гродзенскага абласнога выканкома дэпутатаў працоўных М. Малочкам «Над нёманскімі кручамі» і іншыя матэрыялы.

З мастацкай прозы часопіс друкуе ўрывак з новага рамана Івана Шамякіна, быль Барыса Стральцова «Заклад у Більгудзі», апавяданне Янкі Шарахоўскага «У палёце», замалёўку Уладзіміра Ляўданскага «Складаная сітуацыя» і гумарэску Міхася Скрыпкі «Дзесятае пытанне».

Паэзія прадстаўлена на старонках часопіса вершамі Анатоля Астрэйкі, Алега Лойкі, Кастуся Кірэенкі, Сяргея Грахоўскага, Міколы Хведаровіча, Міколы Макаева і падборкай «З балгарскай паэзіі».

З літаратурна-крытычных матэрыялаў часопіс змяшчае артыкул Івана Кудраўцава «Пра час і пра сябе» — пра кнігу Петруся Броўкі «А дни идут...», кароткія рэцэнзіі І. Жыдовіча на раман Ул. Карпава «Вясеннія ліўні», М. Досіна—на кнігу А. Сінілава «Сцежкамі Прынёмання» і Д. Бугаёва — на кнігу А. Крывіцкага «Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі».

Чытач знойдзе ў часопісе рад пазнавальных матэрыялаў.

# ПЕСНІ ДЛЯ БЫТУ, ДЛЯ АБРАДАЎ.

# *Ці ёсць такія?*

**А. ЗАЛЕСКІ,**
загадчык сектара этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР

□ □

— Якія вы песні спяваеце, за сталом у гасцях?

— А хіба для гэтага патрэбна падбіраць спецыяльны рэпертуар, загадзя складаць праграму? — адкажуць некаторыя на такое пытанне.—Хіба нельга спяваць любую песню, падказаную вясёлым святочным настроем?

Усё гэта, вядома, так. Але ж ніводная, напрыклад, ваша сустрэча са сваякамі ці знаёмымі ў хатняй абстаноўцы не абыходзіцца без таго, каб госці не заспявалі на развітанне «Бывайце здаровы, жывіце багата». Да вядомай песні А. Русака і І. Любана людзі заўсёды з прыемнасцю звяртаюцца, седзячы за святочным сталом у дні ўрачыстасцей. Яна назаўсёды прыжылася ў народзе, трывала ўвайшла ў яго быт.

Значыць, патрэбна больш песень такіх, якія б падыходзілі да пэўнай падзеі ў жыцці чалавека, пэўных бытавых абставін. Нам неабходны не толькі застольныя песні (хоць іх таксама вельмі мала і таму некаторыя нават выцягваюцца са старога, мяшчанскага рэпертуару), але і масавыя харавыя творы, якія адпавядалі б іншым формам культурнага адпачынку працоўных.

Калі мы, скажам, у вольны час катаемся ў чаўне па воднай гладзі ракі, возера ці мора, — хіба ж не ўзнікае ў нас жаданне заспяваць штосьці вясёлае, бадзёрае, адпаведнае добраму настрою? Бо наўрад ці каму ўздумаецца прыгадваць даўнейшую саладжава-сентыментальную песеньку «Мы на лодачцы каталіся...». Яна назаўсёды страціла сваё мастацкае значэнне і адышла ў нябыт.

Затое па-ранейшаму жыве ў народзе цудоўная песня аб Нёмане А. Астрэйкі і Н. Сакалоўскага, якую ўсе з любоўю спяваюць, славячы родны беларускі край і яго цудоўную раку. Але хіба многа ў нас такіх песенных твораў, якія адпавядалі б прыўзнятаму радаснаму настрою чалавека, выкліканаму прыгажосцю роднай прыроды, прыгажосцю новых краявідаў з прамысловымі новабудоўлямі і неабсяжнымі калгаснымі нівамі? На жаль, не.

Калі адсутнасць розных бытавых песень не так востра адчуваецца, бо іх можна часам замяніць жартоўнымі, лірычнымі, гераічнымі песнямі, якія народ ахвотна спявае дома і на вуліцы, дык зусім дрэнныя справы са стварэннем масавых музычных твораў для новых савецкіх абрадаў. Гэтыя творы, калі яны адсутнічаюць, нічым не заменіш: пэўны абрад патрабуе толькі адпаведнай яму песні.

Трэба сказаць, што ў час культу асобы знаходзіліся людзі, якія або зусім адмаўлялі існаванне новых савецкіх абрадаў і рытуалаў, або не надавалі ім асаблівага значэння. Сёння новыя абрады і рытуалы не толькі прызнаюцца, але яны атрымалі ўжо і новае прызначэнне. Наш савецкі абрад — свабодны ад рэлігійнага ўплыву, ад містыкі і забабонаў, ён задавальняе новыя бытавыя і культурныя патрэбы, эстэтычныя густы будаўнікоў камунізма. Рытуал пры выкананні якога-небудзь абраду—гэта пэўны цырыманіял у тым ці іншым урачыстым дзеянні. Натуральна, што нашы рытуалы такія ж новыя па свайму зместу, як і абрады грамадскага і сямейнага быту, да якіх яны адносяцца.

Так, у нашай рэспубліцы і ў іншых братніх рэспубліках Савецкага Саюза шырока праводзяцца дзень партызана, дзень брыгад камуністычнай працы, наладжваюцца цёплыя провады юнакоў у Савецкую Армію, урачыстае ўручэнне пашпарта.

Але дзе песні, прысвечаныя гэтым новым абрадам савецкага грамадства?

Пры ўручэнні пашпарта іншы раз урачыста чытаюць «Вершы аб савецкім пашпарце» Ул. Маякоўскага. Гэта сведчыць аб тым, што народ хоча, каб новыя абрады і рытуалы ўпрыгожваліся творамі савецкіх паэтаў і кампазітараў.

Яшчэ больш патрэбны спецыяльныя песні для сямейных абрадаў — вяселля, акцябрын (свята ў сувязі з нараджэннем дзіцяці), дня нараджэння. З якой цікавасцю наша моладзь шукае новых абрадавых форм, каб, скажам, урачыста адзначыць рэгістрацыю шлюбу. Ужо склаўся пэўны рытуал камсамольскага вяселля. Многа ёсць у ім новых звычаяў, новых рыс. Няма пакуль што новых абрадавых песень. Паралельна з камсамольскім вяселлем у нас бытуе яшчэ хатні абрад вяселля ў выглядзе вечарынкі, а ў вёсцы вельмі пашырана вяселле без рэлігійных забабонаў, але з захаваннем лепшых элементаў традыцыйнага народнага рытуалу.

На вяселлях апошніх двух тыпаў мне, на жаль, даводзілася не раз чуць і «жорсткія рамансы», якія дайшлі да нас з мінулых часоў, і «сучасныя» песні, накшталт «Цёшчынага чамаданчыка». Яны абражаюць пачуцці і псуюць настрой прысутных. Неяк я быў сведкам таго, як на адным з вяселляў у добрай мінскай сям'і госці старэйшага пакалення вымушаны былі забараніць моладзі спяваць адну з непрыстойных, але «модных» у некаторых колах песень.

Як хацелася б, каб на вясельнай вечарынцы гучала сапраўдная, прысвечаная гэтаму святу песня, каб яна задавальняла эстэтычныя густы і «бацькоў» і «дзяцей» і адпавядала пачуццям і густам савецкага чалавека.

У мінулым на хрэсьбінах народ вельмі любіў спяваць жартоўныя песні пра кума, куму, бацькоў, бабку. А чаму б у наш час паэтам і кампазітарам не стварыць для акцябрын таксама жартоўныя песні, але з такімі, напрыклад, пажаданнямі, каб у бацькоў было больш дзяцей, каб маці стала маці-гераіняй і шчасліва і радасна расло дзіця? Як удзячны былі б за ўсё гэта нашым мастакам простыя савецкія людзі. Аднак далей пажаданняў справа яшчэ не ідзе.

Новыя савецкія абрады і рытуалы закліканы адыграць вялікую ролю ў барацьбе з рэлігіяй. Ці ж адно толькі гэта не павінна прыцягнуць нашай пільнай увагі да больш пышнага і ўрачыстага афармлення новых абрадаў і рытуалаў?

На Ўсесаюзнай ідэалагічнай нарадзе ў снежні 1961 года было адзначана, што наша антырэлігійная прапаганда часта не даходзіць да свядомасці веруючых і не закранае самых глыбінь іх душы, іх чалавечых пачуццяў. У сувязі з гэтым хацелася б сказаць пра антырэлігійныя песні. Антырэлігійная песня павінна прысутнічаць у нашым выхаваўчым арсенале побач з рознымі іншымі сродкамі барацьбы супраць рэлігіі, за атэістычнае выхаванне працоўных. Людзі старэйшага веку і цяпер яшчэ добра памятаюць многія антырэлігійныя песні на словы Дзям'яна Беднага, Кандрата Крапівы і іншых паэтаў. Гэтыя песні шырока гучалі ў 20-х гадах і прыносілі вялікую карысць. З якім, напрыклад, запалам спявалася славутая песня «Камсамольскія каляды».

Цяпер культурны ўзровень народа намнога павысіўся, выраслі яго эстэтычныя запатрабаванні і таму «Камсамольскія каляды» ўжо не могуць нас задаволіць. Паэты ў садружнасці з кампазітарамі павінны стварыць новыя музычныя творы на антырэлігійныя тэмы.

Глыбока памыляюцца тыя, хто думае, што савецкая бытавая, абрадавая песня мае меншае значэнне ў камуністычным выхаванні працоўных, чым музычны твор любога іншага жанра. Беларускія паэты і кампазітары, да якіх я, уласна, звяртаюся з гэтым сваім артыкулам, павінны падумаць наконт стварэння новых песень для быту, для абрадаў.

Мне здаецца, што трэба, каб нехта ўзяў на сябе ініцыятыву па каардынацыі агульных намаганняў у стварэнні неабходных народу песень. На першы выпадак можа было б карысна, каб Міністэрства культуры БССР сабрала пісьменнікаў і музыкантаў, а таксама этнографаў і правяло з імі шчырую гутарку на гэтую тэму.

Новых бытавых, абрадавых і антырэлігійных песень з нецярплівасцю чакае народ.

**СУСТРЭЧА З НАРОДНЫМ ПАЭТАМ**

Бібліятэка Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў наладзіла цікавую сустрэчу чытачоў з лаўрэатам Ленінскай прэміі, народным паэтам Беларусі Петрусём Броўкам. Вечар, на які сабралася многа рабочай моладзі, адкрыла загадчыца бібліятэкі А. Шарэйка. Яна дала першае слова крытыку А. Кучару, які расказаў аб творчасці паэта. Затым чытачы бібліятэкі М. Шаўчонак, Н. Бокач, А. Крыцкая чыталі творы П. Броўкі. Цёпла сустрэлі ўдзельнікі вечара народнага паэта. Пятрусь Броўка расказаў аб уражаннях ад паездкі ў Злучаныя Штаты Амерыкі, прачытаў новыя вершы.

У вечары прыняў удзел балгарскі паэт Н. Вылчаў.

На здымку: П. Броўка сярод чытачоў.

Фота Ул. КРУКА.

# Ад Багрыма да Коласа

**Б. ЛАПАЎ**

□

Развіццё літаратуры звязана з развіццём літаратурнай мовы, залежыць ад багацця і ступені апрацаванасці гэтага вялізарнейшага здабытку моўнай культуры народа. Аднак гісторыя беларускай літаратурнай мовы вывучана ўсё яшчэ недастаткова. Па сутнасці можна гаварыць толькі пра пачатак работы ў гэтай важнейшай галіне беларускага мовазнаўства. Таму асаблівае значэнне набывае публікацыя матэрыялаў, якія дапамогуць лепш зразумець працэсы, што працякалі ў нашай літаратурнай мове, дадуць магчымасць высветліць, як складвалася літаратурная мова, як выпрацоўваліся яе нормы. Менавіта такія матэрыялы змешчаны ў другой частцы «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы».

Складальнікі, як аб гэтым гаворыцца ў прадмове, імкнуліся адлюстраваць жывую беларускую мову перыяду ад пачатку XIX да 20-х гадоў XX ст. і «паказаць развіццё беларускай літаратурнай мовы гэтага часу ў яе важнейшых жанравастылявых разнавіднасцях». Трэба сказаць адразу, што аўтары ў асноўным справіліся з гэтымі задачамі.

Першы раздзел «Беларускія народныя гаворкі XIX—пачатку XX ст.» з'яўляецца, па сутнасці, уступным. Складальнікі імкнуліся як мага паўней даць тут узоры жывой народнай мовы XIX ст. Але яны былі вымушаны адыходзіць ад ідэальных прынцыпаў падбору матэрыялу. Да нас дайшло многа песень, казак, легенд, і надзвычай мала запісаў дыялогаў, бытавых размоў, звычайных выказванняў. А фальклорныя творы ў значнай ступені нясуць на сабе адбітак традыцыйнасці, у іх больш захоўваюцца архаізмы, некаторыя ўстойлівыя спалучэнні, выразы. Выканаўца часам можа ўжываць формы, неўласцівыя для яго гаворкі. І яшчэ адно. Збіральнікі запісвалі тэксты па розных прынцыпах (фанетычнаму і фанетыка-этымалагічнаму). А гэта зніжае якасць запісаў. І ўсё ж матэрыял першага раздзела дае пэўнае ўяўленне аб стане беларускіх гаворак XIX—пачатку XX ст. Многія запісы захавалі сваё значэнне і як творы народнага мастацтва. Таму яны прыцягнуць увагу не толькі мовазнаўцаў, але і фалькларыстаў, літаратуразнаўцаў, пісьменнікаў.

Літаратурная мова — гэта агульнанародная мова, апрацаваная майстрамі слова. Для яе перш за ўсё характэрна ўнармаванасць. Але гэтыя нормы не ўзнікаюць адразу, яны складваюцца паступова. Аб гэтым пераканаўча сведчаць матэрыялы другога раздзела — «Беларуская літаратурная мова XIX—пачатку XX ст.». Сюды ўключаны ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», ананімныя гутаркі, вершы, пракламацыі, публіцыстычныя артыкулы, арыгінальныя і перакладныя вучэбна-педагагічныя і навукова-папулярныя творы, мастацкія пераклады. Знойдзе тут чытач творы П. Багрыма, Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, А. Абуховіча, М. Косіч, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Зм. Бядулі. Тэксты друкуюцца па першавыданнях, а ў тых выпадках, калі захаваліся рукапісы,—па гэтых каштоўнейшых крыніцах, нярэдка прыводзяцца розначытанні твора, варыянты першавыдання і рукапісу, першага і другога выданняў. Гэта дае магчымасць прасачыць за работай аўтара над тэкстам твора, за эвалюцыяй форм і канструкцый, за пошукамі літаратурнай нормы і працэсамі яе замацавання.

Факты паказваюць, што ў аснове норм беларускай літаратурнай мовы не ляжаць асаблівасці якога-небудзь аднаго дыялекту, нармалізацыя адбывалася з улікам рыс розных беларускіх гаворак у іх узаемадзеяннях і ўзаемасувязі. І хаця на ранніх этапах складвання новай літаратурнай мовы той ці іншы аўтар у асноўным арыентаваўся на родную гаворку, ужо тады яскравым было імкненне ўзняцца над сваёй гаворкай, пісаць з улікам рыс іншых гаворак, апрацаваць мову, зрабіць яе зразумелай для прадстаўнікоў розных тэрытарыяльных дыялектаў. У гэтых адносінах вельмі паказальным з'яўляецца выказванне А. Абуховіча аб тым, што ён не абмяжоўваецца сваім дыялектам і ўжывае словы і звароты агульнабеларускія. Прагрэсіўны беларускі пісьменнік адзначае: «Я кладу ў літаратуру свой прыродны дыялект беларускай мовы, **даючы найлепшае** з яго» (падкрэслена мною. — **Б. Л.** Хрэстаматыя, стар. 173). У працэсе развіцця літаратуры, у працэсе развіцця літаратурнай мовы рысы агульнанароднай мовы атрымліваюць усё большае пашырэнне. Гэта добра відаць, калі параўнаць, напрыклад, мову ананімных паэм і гутарак з мовай пазнейшых твораў, асабліва з мовай твораў Я. Купалы і Я. Коласа, якія адыгралі выключную ролю ў фармаванні беларускай літаратурнай мовы, у выпрацоўцы і замацаванні яе норм. Класікі сучаснай беларускай літаратуры правільна ацэньвалі ролю мастака слова ў развіцці літаратурнай мовы. «Тварэц мовы—народ,—пісаў Якуб Колас.—Задача ж пісьменніка — у фармаванні, адборы лепшага, у прыядзенні мовы да літаратурных норм. Як бачым, задача немалая. Мы павінны мець мову прыгожую, гучную, простую, але гнуткую і выразную». На прыкладзе змешчаных у хрэстаматыі твораў Я. Купалы і Я. Коласа чытач убачыць, як яшчэ ў пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці гэтыя выдатныя песняры працавалі над мовай, як яны шліфавалі і адточвалі слова. «Узорам таго, як трэба карыстацца гэтым найбагацейшым скарбам, як трэба працаваць над роднай мовай, каб яна заззяла ўсімі колерамі, з'яўляюцца нашы народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас. У іх трэба вучыцца, як выкарыстаць слова ў сапраўдным яго значэнні, як будаваць фразу, каб яна гучала па-беларуску, была простай, зразумелай і несла ў сабе вялікую думку і пачуццё», пісаў Кандрат Крапіва.

Прыведзены ў кнізе матэрыял паказвае, як складваліся публіцыстычны і навуковы стылі, тут даюцца ўзоры вучэбна-педагагічнай і навукова-папулярнай літаратуры (гл. артыкулы «Аб нацыяналізацыі школы», «Пагром», «Песня і народ», «Што такое пярун і як ад яго бараніцца» і інш.). Многім з нас варта звярнуць асаблівую ўвагу на гэтыя творы. На жаль, цяпер работы падобнага характару нярэдка пішуцца горш, чым тады, калі гэтыя стылявыя разнавіднасці нашай літаратурнай мовы толькі складваліся.

Удалыя ўзоры перакладаў мастацкай літаратуры, якія ўключаны ў хрэстаматыю. Яны сведчаць аб вялікай цікавасці беларускай грамадскасці да літаратуры другіх народаў. Тут ўрыўкі з твораў: «Сватанне» А. Чэхава, «Дзед Архіп і Лёнька» М. Горкага, «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага, «Хам» Э. Ажэшкі. Прычым да першых двух урыўкаў для супастаўлення даюцца адпаведныя месцы рускага арыгінала, з якога рабіўся пераклад.

На ранніх этапах фармавання беларускай літаратурнай мовы неабходна было выбраць сістэму графікі. Даволі доўгі час ужываліся як кірыліца, так і лацінка. У хрэстаматыі ёсць тэксты, надрукаваныя і адным і другім шрыфтам. Укладальнікі ўключылі ў кнігу цікавы матэрыял дыскусіі аб графіцы (стар. 201—206). Большасць удзельнікаў абмеркавання рашуча выказалася за «рускі шрыфт», якім беларусы карысталіся і ў старажытнасці, якім карысталіся брацкія рускі і ўкраінскі народы. Газета «Наша Ніва» ў 1912 годзе прыводзіла выказванне па гэтаму пытанню Янкі Купалы: «...абдумаўшы ўсё, як мне сумленне дыктавала, прымаючы пад увагу, што ў нашым краю бадай кожны граматны знае рускія літары, а не лацінскія,—я і прылучаюся да прыхільнікаў аднаго шрыфту ў беларускім друкаваным слове і падаю свой голас за тыя літары, якімі суджана было друкавацца першай беларускай свецкай кніжцы—Статуту Літоўскаму» (стар. 203).

Па тэкстах, прыведзеных у кнізе, відаць, як ішлі пошукі сродкаў перадачы на пісьме асаблівасцей беларускай мовы. Так, у «Энеідзе навыварат» **ц** мяккае перадаецца праз **ть**, для абазначэння **ё** ў шэрагу твораў дапускаюцца **іо, ю, ё**, па-рознаму абазначаюцца **у кароткае (ў), шч (щ і шч)**, не заўсёды адлюстроўваюцца на пісьме характэрныя рысы беларускай фанетыкі: аканне і яканне і г. д. Але паступова і ў гэтай галіне выпрацоўваюцца адзіныя прынцыпы і адзіны падыход.

«Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» каштоўная не толькі як мовазнаўчая работа. У ёй зноў убачылі свет многія «забытыя» творы, яна дала чытачу крыніцы, якія даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Аднак варта адзначыць, што трэба было больш шырока падаць ананімныя гутаркі, уключыць у кнігу ўзоры мовы дзеячоў, якія выступалі з пазіцый рэлігіі, царызму і г. д... Гэта дало б магчымасць прасачыць за мовай прадстаўнікоў розных ідэйных плыняў, што, безумоўна, мае значэнне для высвятлення барацьбы за нормы літаратурнай мовы.

У «Хрэстаматыі» ёсць неабходныя дадаткі: слоўнікі да тэкстаў, агляд графічных і арфаграфічных асаблівасцей тэкстаў. У заўвагах тлумачацца вузка дыялектныя формы, асобныя звароты, спалучэнні, даюцца пераклады іншамоўных выразаў. Праўда, гэтыя тлумачэнні не заўсёды патрэбныя. Ці варта адзначаць, што **тэй** гэта **той, шчэ—яшчэ**, спыняцца на словах тутака, усенька, ляпей, мецімі (ад мець) і інш.

Кніга разлічана на студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, але яна, бясспрэчна, знойдзе ўдзячных чытачоў і сярод настаўнікаў, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў. Яна патрэбна нашым даследчыкам і даследчыкам з братніх сацыялістычных краін. «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» — работа добрая, цікавая, патрэбная. Яна гаворыць аб шляхах нашай літаратурнай мовы, аб яе росце і ўзбагачэнні, аб развіцці мастацтва слова.

«Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы», ч. II. Рэдактар член-карэспандэнт АН СССР Р. І. Аванесаў. Складальнікі І. В. Анічэнка, П. В. Вярхоў, А. І. Жураўскі, Я. М. Рамановіч. Выдавецтва АН БССР. Мінск, 1962.

## ВІЦЯБЛЯНЕ—НА МІНСКІМ ТЭЛЕЭКРАНЕ

Днямі мінскія тэлегледачы бачылі вялікую працу Віцебскай тэлестудыі — пастаноўку «Выпрабаванне» па аповесці В. Цендракова «Суд». Гэты спектакль трансліраваўся з мінскай студыі. За рэжысёрскім пультам і ля тэлевізійных камер працавалі госці.

Віцебскі тэлеспектакль пастаўлен рэжысёрам Ю. Собалевым, у ім заняты артысты Беларускага тэатра імя Якуба Коласа. Асаблівае запомнілася работа народнага артыста БССР А. Труса, які стварыў яркі вобраз старога паляўнічага Сямёна.

Добра справіліся са сваімі ролямі здольныя маладыя артысты А. Мілаванаў, І. Нагаўкін і іншыя.

Удалая работа Віцебскай студыі тэлебачання гаворыць пра тое, што яе творчы калектыў, нягледзячы на многія цяжкасці (адсутнасць вялікай студыі, кіназдымачнай апаратуры), здольны ствараць вялікія арыгінальныя тэлевізійныя пастаноўкі.

Абмен мастацкімі пастаноўкамі сталічнай і абласных тэлестудый, пачаты гэтым спектаклем, варта працягваць надалей.

На здымку: сцэна са спектакля (справа налева). У ролі Сямёна—А. Трус, у ролі начальніка будаўніцтва — І. Нагаўкін.

## У ЧЫРВОНАПОЛЬСКІМ НАРОДНЫМ

За апошні час самадзейныя артысты Чырвонапольскага народнага тэатра паспяхова выступалі са спектаклямі ў Крычаве. Слаўгарадзе і іншых раённых цэнтрах, а таксама ў калгасах і саўгасах Магілёўскай вобласці. Яны паказалі спектаклі па п'есах рускіх і беларускіх драматургаў. Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаюцца спектаклі — «Папараць-кветка» па п'есе І. Козела, «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка.

Цяпер калектыў тэатра рыхтуе новы спектакль «Барабаншчыца». Галоўную ролю ў ім будзе выконваць інструктар раённага Дома культуры Фаіна Лісіцына.

## ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ГЕРОЯМ БРЭСТА

У тэатральнай зале Палаца культуры імя Ул. І. Леніна сабраліся працоўныя Гомеля. Тут адбыўся вечар, прысвечаны героям Брэста. Удзельнікі вечара цёпла сустрэлі ўдзельніка абароны Брэсцкай крэпасці Пятра Клыпу, які прыехаў у Гомель з Бранскай вобласці і выступіў з расказам аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці. У заключэнне вечара быў прадэманстраваны кінафільм «Героі Брэста».



# АРЫГІНАЛЬНАСЦЬ І АРЫГІНАЛЬНІЧАННЕ

**Мікола АРОЧКА**

Правільна кажуць: чым больш талент у пісьменніка, тым ён арыгінальнейшы. Сапраўдны талент пазнаецца ў першую чаргу па той выключнай самабытнасці, што прабіваецца як бы «знутры» самой паэтычнай натуры і кладзе свой адбітак на ўсім: на задуме і своеасаблівасці бачання жыцця, на сплаве думкі, вобраза, формы.

Ніхто не адмовіць у арыгінальнасці маладому паэту Алесю Наўроцкаму. Яго вершы, сабраныя ў першай кніжцы «Неба ўсміхаецца маланкаю», ужо не раз выклікалі ў адных—захапленне і падтрымку, у другіх — супярэчлівае ўражанне, насцярожанасць, але ўсе сыходзіліся на адным: гэта паэт самабытны, арыгінальны. А значыць — і таленавіты.

А. Наўроцкі досыць выразна праявіў сябе ўжо ў адным з першых вершаў — «Рукі». Так мог гаварыць толькі паэт арыгінальны, са сваім ладам мыслення:

Рукі мазалямі пакрыты вех
цэлы.
Мазалёў тых хапіла б, каб усіх
гультаёў надзяліць.
Варта абхапіць далонямі кацёл
вады зледзянелай—
І кацёл вады закіпіць.

Ужо тут акрэсліўся адзін з улюбёных прыёмаў паэта — смелае паэтычнае перабольшванне. Дзякуючы яму ў нас узнікае ўспрыняцце вобразаў не канкрэтнае, не прадметнае, а пераноснае, асацыятыўнае. Сапраўды, колькі дужасці і гарачай крыві ў тых працавітых руках, ад якіх можа закіпець кацёл вады зледзянелай. Гэта рукі народа-творцы!

А якую добрую службу нясе гэтае перабольшанне ў невялічкім вершы «Па Акмолінскім стэпе»! Прывядзём яго цалкам:

Па Акмолінскім стэпе вецер
хадзіў-гуляў,
Капялюш саламяны з маёй
галавы сарваў.
Крыкнуць ветру хацеў я:
«Што ты робіш?
Не руші»
Пакаціўся далёка мой капялюш.
Праганяючы стомленасць,
праганяючы сон,
На камбайне пагнаўся я за ім
наўздагон.
Дзе шастае жытоў медна-
бронзавы сплаў,
Трыццаць дзён ка камбайне яго
даганяў.
Даганяў—не дагнаў. Знаю сам:
не бяда.
Але стэп як успомню —
чагосьці шкада...

Было б недарэчна прымаць тут кожнае слова літаральна, у прамым сэнсе, бо хто ж гэта, сапраўды, будзе трыццаць дзён на камбайне даганяць сарваны ветрам капялюш. Нашу ўвагу забірае другое — той неабсяжны «медна - бронзавы сплаў» жытоў, дзе на адзін толькі заход камбайна спатрэбіцца цэлы месяц. Які велічны малюнак залатога стэпавага багацця!

Ёсць вялікая праўда ў тым, што сучаснае паэтычнае мысленне не можа быць без смелых і новых па свайму складу мастацкіх вобразаў. Сцёртыя, як падкоўка ў старым боце, вобразы і дэталі не звяртаюць на сябе нашу ўвагу, не абуджаюць думку.

А. Наўроцкі якраз і знаходзіцца на шляху пошукаў гэтага дзейснага мастацкага вобраза. Якім глыбокім сэнсам напоўнены радкі:

Слухае свет, як цурчыць
Малако ў дайніцах
У Амерыцы і ў нас.
Кукуруза ў яслях нашых кароў
Ляжыць.
Мы верым —
Наша перацурчыцы!

Паэт засяроджвае нашу ўвагу на адным гуку, у які ўслухоўваецца свет. Адна дэталь, а як добра яна даносіць чытачу нашу ўпэўненасць у хадзе да светлай будучыні. За паэтызацыю нашых надзённых спраў А. Наўроцкі бярэцца смела, памаякоўскі. Іменна гэтай асаблівасцю (а не толькі мастацкім прыёмам звароту) пераклікаецца яго верш «Размова з Уладзімірам Ільічом» з вядомым вершам Маякоўскага. Лірычны герой звяртаецца да Уладзіміра Ільіча па-чалавечы шчыра і душэўна, з ледзь прыкметным укутраным хваляваннем. Яму хочацца расказаць пра нашы самыя смелыя заваёвы і поспехі. Уладзімір Ільіч, як бы гаворыць паэт, калі б вы пабачылі тое зялёнае «дрэва, якое садзілі і любоўна расцілі Вы», і таго чалавека, што «з космасу апусціўся на тры мільярды ўгору паднятых рук», і ўбачылі, як «сыплецца, сыплецца ад каланіяльнай палітыкі парахня», то

Як бы маглі Вы ўсміхнуцца
І задаволена прыжмурыцца!

Мастацкія дэталі, з дапамогай якіх паэтызуюцца нашы дасягненні, не проста наніззаюцца на стрыжань паслядоўнасці, не сілком нагнятаюцца ў радкі, а ўзнікаюць па меры неабходнасці, нечакана і ярка. Стары, як свет, вобраз нашай маці-зямлі нечакана пад пяром мастака раздаўся ўшыркі, напоўніўся глыбокім падтэкстам.

Нашая ж планета—гэта мама.
А дзеці не вечна
трымаюцца
за спадніцу
Маці сваёй.

Час вялікіх здзяснення, якія робяць зямлю якасна другой, сцвярджаецца і радкамі: «Як яблык, планета Зямля выспявае ў садзе планет і зор!»

З публіцыстычнай гарачынёй напісана паэма «Стрэл у твар смерці». Задумана яна арыгінальна. Смерць—гэта не толькі вайна, але і сам капіталізм — зачыншчык войнаў, які паслаў тую смерць, што забрала ў нас «мільёны ранкаў», пахавала «мільёны сонцаў», пацалункаў, усмешак. Нашы стрэлы ў твар смерці — гэта «яшчэ больш умацаваны сацыялізм», гэта тая звыш плана надоеная кропля малака, якая забяспечыць нам перамогу, гэта нашы ўсмешкі, якія мы нясём у стэп цаліны. І яшчэ:

Грымяць, грымяць зараз
Стрэлы
У смерці маршчыністы
Твар!
СССР—
стрэл...
Кітай —
стрэл...
Афрыка —
стрэл...

Светаадчуванне паэта, як бачым, надзвычай своеасаблівае. Міжволі задумваешся: адкуль у маладога паэта такі склад мыслення! Добра, калі гэта ідзе ад самой пісьменніцкай натуры, а не ад начытанасці, кніжнасці. Сапраўды, дзе-нідзе за радкамі бачыш Уітмена, яго манеру пісьма («Пада мною у зямлі песня гніе. Гніюць пацалункі. Усмешкі і смех гніюць»). Але гэтыя далёкія рэмінісцэнцыі знаходзяць свой адбітак хутчэй на форме, а не на змесце верша. Адчуваюцца, шчыра кажучы, інтанацыі і сучасных лацінаамерыканскіх паэтаў. Параўнайце, напрыклад, дзевяты раздзельчык паэмы А. Наўроцкага, дзе гаворыцца пра чай Хамаршэльда, з той мясцінай з паэмы Пабло Неруды «Няхай прачнецца лесарубі», дзе вельмі каларытна расказваецца пра кактэйль Маршала—агульнасць гэтых дзвюх мясцін настолькі відавочная, што наводзіць на думку аб запазычанасці. Аднак справа не ў падабенстве паасобных паэтычных ходаў ці вобразаў, якія і сапраўды могуць часам супадаць. Урэшце, паэт мае права на творчую вучобу ў любога таленавітага пісьменніка. Важней другое: гэта не сляпое перайманне, не эпігонства. У А. Наўроцкага вобразы свайго паходжання. («Ляцела-ляцела і на галінку вішні прысела вясна...», «Стаіш і зачарована слухаеш, як мяўкаюць коцікі на галінках ракіт», «Белым бінтам бяроза бінтуе рану, якую пакінуў цяжкі асколак»).

А. Наўроцкі — не прыхільнік традыцыйнай складнасці і напеўнасці радка, філігранай адточкі слова, ці нават хлёсткай рыфмы. Яго ўся ўвага як бы скіравана на пошукі важкага вобраза-мыслі, і адпаведна яму—рытмічна-інтанацыйнага складу радка. Гэта асабліва адчуваецца ў паэме. Вось досыць яркі, запамінальны фрагмент:

Акіян бушаваў.
Ён ніколі не быў ціхмяны.
Бушаваў тысячагоддзяў сто.
Маркс!
Ты калісьці ля гэтага акіяна
Паставіў свой пісьмовы
Стол.

Паэт развівае, ускладняе вобраз, і мы яго ўспрымаем цалкам:

Гэта быў з чалавечых дум
Акіян кіпучы.
О, натхнення салодкі боль.
Больш за сорак гадоў
Ты адмучыў,
Каб з акіяна
Вылавіць соль.

Але цэласнай мастацкай завершанасці ў паэме няма. Яна рыхлаватая, фрагментарная. На яе фактуры больш, чым на другіх творах пакінула сляды тая хвароба, на якую яшчэ не перахварэў талент А. Наўроцкага. Жаданне гаварыць арыгінальна вельмі ж часта пераходзіць у яго ў арыгінальнічанне. Узнікае яно, можа, і не заўсёды свядома. Паэту здаецца, што яго вачыма будзе не цяжка глядзець кожнаму, хто возьме ў рукі яго кніжку. Так узнікаюць невыразныя, залішне ўскладненыя, а то і безгустоўныя вобразы, «развітыя за кошт розуму» (Бялінскі). Што азначае, напрыклад, такі радок: «Выдаіць смяротную кроплю малака»? Імкненне сарыгінальнічаць адчуваецца і ў вобразе: «Ніва — карова: пасвіцца на пашы Лета, Восені, Зімы». Мы да канца сочым за развіццём гэтага нечаканага і трохі дзіўнаватага вобраза, але так і не ведаем, нашто аўтару спатрэбілася ніву рабіць каровай — каб давесці, што ніву трэба не менш даглядаць, чым карову? З такім жа поспехам мы можам разважаць і наадварот.

Алесь Наўроцкі. «Неба ўсміхаецца маланкаю». Паэзія. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск. 1962 г.

Давід КВІЦАРЫДЗЕ

# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, БЕЛАРУСЬ!

Вядомы грузінскі пісьменнік Давід Васільевіч Квіцарыдзе (Васкалішвілі)— удзельнік партызанскага руху на Віцебшчыне. Ён быў начальнікам штаба атрада ў брыгадзе імя Заслонава. Узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі і медалем «Партызану Айчыннай вайны» 1-ай ступені.

Зараз працуе адказным сакратаром Кутаіскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Грузіі. Нядаўна ён наведаў сваіх баявых сяброў на Віцебшчыне.

Ніжэй мы змяшчаем яго два вершы «Мой мілы край» і «Успамінаю тыя дні», якія пераклаў на беларускую мову Анатоль Астрэйка.

## МОЙ МІЛЫ КРАЙ

Цябе, мой мілы край, наведаў зноў.
Тут я ўзмужнеў, тут быў я партызанам.
Табе мая пашана і любоў,
Табе, як Грузіі, мая адданасць.

Мяне тут радуюць лясы, сады,
Заходняя Дзвіна зітае хваляй.
Мяне чаруюць вёскі, гарады,
Што непішымі, чым да вайны, пасталі.

Я ў Ардышаўскія лясы прыйшоў.
Тут мне сцяжынка кожная знаёма.
Трапечацца лісця зялёны шоўк,
І чую лесу я суладны гоман.

Вось меднаствольная сасна — шацёр
Раскінула шырока над узлескам.
Прыстанкам быў мне беларускі бор,
Адсюль мы ворагу расплату неслі.

Я зберагаю памяць аб тых днях.
Яны мне і цяпер крывавяць сэрца.
. . . . . .
Дрыжу ад хвалявання, і сасна...
Сасна дрыжыць і слёзы лье, здвецца.

Яе чужынец купямі пасек,
Сасну і тую злосна апаганіў.
Прышоў к ёй з добрым сэрцам чалавек.
Перавязаў, як чалавеку, рану.

Ля сосен дол капалі дружбаку.
Загінуў ён, герой, у бітве ратнай.
Астаўся толькі ўзгорачак пяску,
Сагрэты партызанскай грознай клятвай.

Народ герою помнік тут узнёс.
І помнік ранкам сонцавы праменні
Страчае ў купе сосен і бяроз.
А я, я станаўлюся на калені.

— Устань, да нас ты падыдзі і абдымі,—
Мне ціха шэпчуць сосны і бярозы,—
Тут ваяваў ты, ворагаў граміў
За гора наша і за нашы слёзы.

І я стаю, абняўшыся з сасной,
З гарачым сэрцам, роснымі вачыма.
Палае ярка сонца нада мной,
Над партызанскаю маёй радзімай.

Я аддаваў вам кроў, цяпер душу аддам,
Пра вас ракой у песнях разальюся.
Гукаю радасна:
— Дзень добры вам,
Браты і сёстры звонкай Беларусі.

## УСПАМІНАЮ ТЫЯ ДНІ

Янку КУПАЛУ

Успамінаю тыя дні
Яны як сон, як страшны сон,
Але нам не забыць тых дзён.
Хадзіў я па тваёй зямлі
У партызанскім шынялі.

І шапаток лісця бяроз,
І голу д'ябальскі запал,
Як помсту ворагу, я нёс,
Сын Грузіі, каўказскіх скал.

Я сын радзімы, я салдат,
І я змагаўся так, як мог,
Каб фашыстоўскі супастат
Народ наш пакарыць не змог.

Грузін я, брат мой беларус,
Мы разам на тваёй зямлі
Фашысцкі нішчылі прымус,
Хадзілі ў шэрым шынялі.

Я тут пачуў упершыню
Купалы мужныя радкі,
Яны падобныя агню,
Яны бяссмертныя стралкі.

Купала, ты жывеш і не памрэш,
Хоць кажуць, што памёр.
Не веру я. З народам ты ідзеш
І між маіх каўказскіх гор.

Таму я сёння не маўчу,
Табе любоў сваю нясу.
Грузінскіх я дзяцей вучу
Любіць тваіх радкоў красу.

## Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве Беларусі выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

**Мікола Арочка.** Ветраломная паласа. Вершы. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 2.500 экз., стар. 100. Цана 12 кап.

**Аляксандр Міронаў.** Толькі мора навокал... Дылогія. Мастак С. Спіцын. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 784. Цана 1 руб. 73 кап.

**Ч. Айтматаў.** Джаміля. Аповесць. Пераклад з рускай мовы І. Сакалоўскага. Тыраж 2.750 экз., стар. 100. Цана 8 кап.

**Генадзь Кляўко.** Абветраныя далягляды. Вершы. Мастак В. Харэўскі. Тыраж 2 тыс. экз., стар. 100. Цана 10 кап.

**Ігар Шклярэўскі.** Я ідуі Вершы. На рускай мове. Мастак В. Сафронаў. Тыраж 2.500 экз., стар. 100. Цана 13 кап.

Да стагоддзя выхаду „Мужыцкай праўды"

# СЛОВА-НАБАТ

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ

Сто гадоў таму назад, у верасні 1862 года, рыпучую чыноўніцкую машыну царскай Расіі затрэсла неспадзяваная ліхаманка. Па суроваму загаду на ногі ўзнялася ўся жандармерыя і паліцыя Гродзеншчыны, паляцелі сакрэтныя дэпешы і рэляцыі ў Вільню — генерал-губернатару Паўночна-Заходняга краю, і ў Пецярбург—шэфу жандараў і самому цару.

Ва ўсіх гэтых загадах, цыркулярах, следчых данясеннях на розныя лады чарнілася і скланялася газета «Мужыцкая праўда», некалькі экземпляраў якой 10 чэрвеня 1862 года ўпершыню трапіла ў рукі царскіх апрычнікаў у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні.

«Дзецюкі!

Мінула ўжэ тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здасце толькі да сахі, — цяпер настаў такі час, што мы самі можэм пісаці, і то пісаці такую праўду справедлівую... О, загрэміць наша праўда і як маланка перэлеціць па свеці! Нехай пазнаюць, што мы можэм не толькі карміць сваім хлебом, но ешчэ і ўчыць сваей мужыцкой праўды», — чытаў першы нумар газеты які-небудзь паліцэйскі прыстаў у Слоніме ці земскі начальнік у Ашмянах і ў яго дрыжалі рукі, а валасы са страху станавіліся дыбам.

Усё ў гэтай падпольнай газеце было неспадзявана крамольным: і бунтарскі дух, і антыцарскія настроі, і суровая крытыка «ўсеміласцівага» маніфеста.

Мелася яшчэ адна немалаважная крамола: «Мужыцкая праўда» напісана была на мове беларускага селяніна, на мове, на якой было забаронена друкаваць.

«Гэту «Мужыцкую праўду» напісаў і зноў пісаці будзе Яська—гаспадар з пад Вільні», — чыталі царскія чыноўнікі заключныя радкі газеты і называлі яе ў даносах па начальству: «Бунтоўная брашура»; «Разбуральная газета»; «Дзёрзкая пракламацыя»; «Лятучыя лісткі абуральнага зместу»; «Ганебная адозва»; «Агідны лісток».

Чыталі сяляне «Мужыцкую праўду», адмаўляліся ісці на паншчыну, палілі панскія маёнткі, браліся за сякеру і касу. Чытаючы газету, яны успаміналі Васіля Світку — маладога, невысокага росту чалавека, які ад вёскі да вёскі хадзіў па Гродзеншчыне, гаварыў людзям на іх роднай мове праўду пра царскі маніфест, заклікаў дзяліць панскую зямлю і брацца за зброю.

Царскія памагатыя збіліся з ног, шукаючы патайную друкарню, няўлоўнага і загадкавага Яську—гаспадара з-пад Вільні. Яны расстрэльвалі, высылалі на катаргу ў Сібір, саджалі ў турму, секлі бізунамі тых, хто чытаў газету.

А «Мужыцкая праўда», нягледзячы на ўсе перашкоды і забароны, ішла ад хаты да хаты па беларускай зямлі, трапляла пад саламяныя стрэхі не толькі на Гродзеншчыне. Яе чыталі на Віцебшчыне, Міншчыне і Мазыршчыне, асобныя нумары газеты даходзілі нават у Свянцянскі, Дынабургскі і Люцінскі паветы (тэрыторыя сучаснай Літвы і Латвіі). Звесткі пра распаўсюджванне «Мужыцкай праўды» трапілі ў рускія газеты «День», «Северная пчела», «Виленский вестник», пра яе пісаў герцэнаўскі «Колокол».

Праклёны і лаянка ў царскіх канцылярыях сыпаліся ў адрас Яські—гаспадара з-пад Вільні, а ў сялянскіх хатах вясковы грамацей, прысеўшы ля лучніка, чытаў па складах чарговы нумар «Мужыцкай праўды» і хваліў яе аўтара. Але ніхто не ведаў, што Яська — гаспадар з-пад Вільні, гэта той самы Васіль Світка, Макарэвіч, Хамовіч, Чарноцкі, сапраўднае прозвішча якога — Кастусь Каліноўскі.

Чалавек кіпучай энергіі і вялікага ўзлёту творчай думкі, К. Каліноўскі як ніхто разумеў, што сялянская рэвалюцыя будзе пераможнай толькі тады, калі ў ёй прымуць удзел шырокія народныя масы. А каб узняць сялянства на барацьбу, трэба растлумачыць яму антынародны, прыгонніцкі характар рэформы 1861 г., трэба развеяць «царысцкія» ілюзіі, паказаць сапраўдных ворагаў і заклікаць народ да сякеры. Аднаго хаджэння ў народ жменькі самаахвярных энтузіястаў, пераадзетых у сялянскую вопратку, было мала. Гэта бачыў К. Каліноўскі на сваім асабістым вопыце. Жыццё і задачы рэвалюцыйнай барацьбы патрабавалі больш дзейсных і эфектыўных сродкаў агітацыі, якія, мінаючы рагаткі царскай цэнзуры, даносілі б праўдзівае слова народным масам. Патрэбен быў вольны бесцэнзурны беларускі друк.

Так з'явілася адна з першых ластавак беларускага перыядычнага друку — рэвалюцыйна-дэмакратычная газета «Мужыцкая праўда». Аб тым, што «Мужыцкая праўда» — гэта менавіта газета (а не адозва ці пракламацыя, як схільны лічыць нават і цяпер некаторыя даследчыкі), сведчыць перыядычнасць, нумарацыя і пастаянная назва выдання, цана нумара, знешні выгляд (тэкст друкаваўся на абедзвюх старонках), а таксама—што вельмі важна! — выказванне самога К. Каліноўскага ў «Пісьме з-пад шыбеніцы».

«Мужыцкая праўда» выдавалася на беларускай мове, друкавалася лацінкай, вядомы сем нумароў яе. Месца выдання газеты дакладна невядома. Некаторыя гісторыкі лічаць, што яна выдавалася ў Беластоку, другія — у Гродна, трэція — у Вільні, чацвёртыя — у Белавежскай пушчы. Найбольш верагодна, што розныя нумары выдаваліся ў розных мясцінах Гродзеншчыны.

Трэба адзначыць і такі факт, на які да гэтага часу чамусьці не звярнулі ўвагі даследчыкі і які сведчыць аб вялікай папулярнасці «Мужыцкай праўды»: паасобныя нумары газеты (№№ 5 і 7) выдаваліся паўторна. Захавалася выданне нумара 5 на адной старонцы і такі самы тэкст, толькі з невялікай прыпіскай і іншага набору на дзвюх старонках. Два выданні № 7 адрозніваюцца паміж сабой толькі шрыфтам у наборы загалоўка. Відаць, аднаго тыражу было мала, спатрэбілася яшчэ адно выданне.

У выданні і напісанні газеты, апрача К. Каліноўскага, прымалі ўдзел актыўныя ўдзельнікі паўстання Валерый Урублеўскі і Фелікс Ражанскі. Аднак параўнанне тэксту «Мужыцкай праўды» з «Пісьмом з-пад шыбеніцы», якое, як дакладна вядома, належыць пяру беларускага сялянскага дэмакрата, іх дыялектных і стылявых асаблівасцей дазваляе рабіць вывад, што асноўным аўтарам ці адным з галоўных саўтараў або рэдактараў «Мужыцкай праўды» быў, бясспрэчна, Кастусь Каліноўскі.

«Мужыцкая праўда» — гэта цікавейшы помнік беларускай агітацыйнай літаратуры, самае радыкальнае з усіх выданняў, якія выходзілі напярэдадні і ў час паўстання 1863 г. Яна вызначаецца сваёй матанакіраванасцю, заклікам да барацьбы з прыгнятальнікамі, глыбінёю пастаноўкі і вырашэння сялянскага пытання, вострым палемічным запалам і яркай народнай гутарковай мовай. «Мужыцкая праўда» была баявой трыбунай К. Каліноўскага і яго ідэйных панлечнікаў, у ёй з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый асвятлялися актуальныя праблемы грамадска-палітычнага жыцця свайго часу.

Праз усю газету чырвонай ніццю праходзіць самае важнае і злабадзённае пытанне — пытанне зямлі і волі. К. Каліноўскі выкрывае хвалёны царскі маніфест аб скасаванні паншчыны, паказвае, што аграрная рэформа праведзена ў інтарэсах памешчыкаў: «А гэты маніфест, што цар з сенатом і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае, да чэго ён падобны, — ніякай у ём нема праўды, нема з его для нас ніякой карысці» («Мужыцкая праўда» № 1). У газеце даволі выразна выказаны народныя спадзяванні і імкненні: «Мы ўжэ пазналі, што нам не маніфестаў, а вольнасці патрэба— і то вольнасці не такой, якую нам цар схочэ даці, но якую мы самі, мужыкі, памеж сабою зробімо» (№ 3).

Адносна зямлі ў газеце пасляпоўна праводзіцца думка, што «мужыкі панскія і казённыя **не павінны плаціць ані чыншу паном, ані аброку ў казну за землю»** (падкрэслена мною.—**С. А.**). К. Каліноўскі пераканаўча даводзіць права сялян на зямлю без выкупу: яны «кроўнаю працэй дзесяць раз ужэ на ее зарабілі да заплацілі».

Кідаецца ў вочы надзвычай характэрная і паказальная акалічнасць: некаторыя месцы «Мужыцкай праўды» перакліканцца сваімі матывамі з пракламацыямі, якія выдаваліся рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі М. Чарнышэўскім, Н. Шалгуновым і іншымі. Як і ў пракламацыях «Панскім сялянам ад іх добразычлівуцаў паклон» і «Да маладога пакалення», у газеце К. Каліноўскага многа ўвагі адводзіцца ўзаемаадносінам сялянства і пануючых класаў, развенчванню наіўнай веры ў «добрага» цара: «Обецаў нам цар землю, чыноўнікі, попы ды москалі (маецца на ўвазе царская адміністрацыя.—**С. А.**) усі ў адзін голас дурылі нас, што цар нам шчыро думае, да дасць волю, справедлівую волю. Падмануў жэ нас цар... Цар обецаў нам даць вольносць—да не даў...».

Выкрываючы антынародную аснову царскай улады, К. Каліноўскі гаворыць пра дэмакратычную сутнасць сапраўднага ўрада: «Не **народ зроблены для** ранду (ураду. — **С. А.**), **а рад для народу»** (падкрэслена мною.—**С. А.**).

У «Мужыцкай праўдзе» гучыць смелы пратэст супраць прыгнёту селяніна: «Нема чэго ждаці ад нікого, бо той только жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою, не шкадуйце працы, каб і мужык быў чалавекам вольным». Грозная перасцярога чуецца ў кожным слове, адрасаваным цару і прыгнятальнікам: «...Памятайце, што і на вас прыйдзе пара, памятайце, што калі мужык разгуляецься, то як свет шэрокі, кроў ваша пальецься!!!» А ў сёмым нумары газеты, які выйшаў у час паўстання, К. Каліноўскі прама і адкрыта звяртаецца з заклікам да барацьбы: «Ждань моўчкі больш ужэ не змога!.. Трэба нашым хлопцам спешыць, з віламі да косамі там, гдзе добіваюцца волі да праўды...».

Есць у «Мужыцкай праўдзе», якая з'яўляецца яскравым узорам рэвалюцыйнай публіцыстыкі 60-гадоў пэўныя недахопы і памылковыя сцвярджэнні. Так, у 6 нумары газеты абараняецца уніяцтва, памылкова тлумачацца прычыны ўзнікнення паншчыны.

Памылкі і слабасці светапогляду беларускага сялянскага дэмакрата вызначаны тагачаснай эпохай. Таксама трэба ўлічваць і тое, што не ўсё, падпісанае псеўданімам «Яська — гаспадар з-пад Вільні», выйшла з-пад пяра Кастуся Каліноўскага і не з усім ён пагаджаўся.

Значэнне «Мужыцкай праўды» ў гісторыі развіцця грамадскай думкі на Беларусі не вычэрпваецца толькі тым, што гэта было вольнае агітацыйнае слова. Па сваёй форме і вобразнай мове, насычанай яркімі параўнаннямі, народнымі фразеалагізмамі і трапнымі гутарковымі эваротамі, газета з'яўляецца творам мастацкай публіцыстыкі, узорам баявой айчыннай журналістыкі. К. Каліноўскі, дасканала валодаючы жывой беларускай мовай, вядзе простую і сардэчную размову з селянінам, умела развівае думку і робіць адпаведныя акцэнты:

«Працуе бацько цяжко на дзецеткі свае, гадуе маці сына, ночэнькі не спіць, а цар, сабака яго вера, як гэты воўк, закраўшыся, вяліць лавіці, у дубы скуці і гнаці ад радні далёка... Не, такога ліха, дзецюкі, і скаціна не знае, а вы, мае міленькія, пэўна і не падумалі, скуль яно на нас навязалася...»

Прайшло стагоддзе з таго часу, калі з'явілася «Мужыцкая праўда», у якой К. Каліноўскі выказаў светлае спадзяванне беларускага селяніна, што «загрыміць наша праўда» і працоўны чалавек будзе вольна гаспадарыць на сваёй зямлі. Гэты час прыйшоў: нябачана расквітнела гаспадарка і культура Беларусі, вялікія дасягненні мае беларускае мастацкае слова і перыядычны друк. І сёння мы павінны з пашанай успомніць Кастуся Каліноўскага — вялікага сына беларускага народа, аднаго са слаўнай кагорты рэвалюцыйна-дэмакратычных дзеячоў мінулага.

На парозе — некалькі важных юбілейных дат, звязаных з жыццём, рэвалюцыйнай і творчай дзейнасцю К. Каліноўскага: 125-годдзе з дня нараджэння, стагоддзе пачатку паўстання 1863 г. і стагоддзе смерці аўтара «Мужыцкай праўды» і «Пісьма з-пад шыбеніцы». Гэта нас, удзячных нашчадкаў, да многага абавязвае!

В. ДАНЕНКАЎ. Вера Харужая. Скульптура.

## ВЕЧАР У ВАРШАВЕ

Днямі ў Варшаве адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны творчасці Я. Купалы і Я. Коласа ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння двух выдатных беларускіх паэтаў. З дакладам аб творчасці беларускіх паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа выступіў Е. Енджэевіч.

Сардэчна сустрэлі прысутныя выступленне вядомага беларускага паэта Максіма Лужаніна. Удзельнікі вечара з вялікай цікавасцю выслухалі госця, які гаварыў пра значэнне творчасці і ўплыў Я. Купалы і Я. Коласа на беларускую літаратуру, пра іх выключную, сардэчную дружбу з таленавітым польскім народам, пра любоў да літаратуры Польшчы.

У заключэнне вечара адбыўся вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел артысты варшаўскіх тэатраў і калектыў артыстаў Беларускай ССР, якія знаходзяцца на гастролях у Польшчы.

(ТАСС).

## НА СТЭНДАХ — КНІГІ ПЕСНЯРА

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна адкрылася вялікая выстаўка, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага песняра Янкі Купалы. На выстаўцы экспануецца каля 200 розных выданняў кніг народнага паэта і твораў, прысвечаных Я. Купалу.

На выстаўцы шмат кніг, якія даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Сярод іх «Адвечная песня» і «Гусляр», выдадзеныя ў 1910 годзе, «Паўлінка» — пецярбургскае выданне 1913 года. Шырока прадстаўлены творы, напісаныя паэтам у гады мірнага будаўніцтва. Прыцягвае ўвагу маленькая кніжачка ў простай папяровай вокладцы. На ёй надпіс «Беларускім партызанам». Гэта — выданне газеты «Савецкая Беларусь» 1942 года.

Кнігі паэта шырока прадстаўлены ў раздзелах: «Творы Я. Купалы ў перакладзе на рускую мову», «Творы Я. Купалы, пакладзеныя на музыку», «Літаратура аб жыцці і творчасці Я. Купалы» і інш.

Добрая самадзейнасць у Мінскім гарадскім прафтэхвучылішчы № 32. Танцоры, спевакі і музыканты вучылішча заўсёды жаданыя госці ў клубах сталіцы.

Гляньце на гэтых жыццярадасных дзяўчат. Завуць іх Ала Дубава і Ліля Русіновіч. Сяброўкі вучацца ў адной группе, разам выступаюць на сцэне. Камсамолкі — лепшыя салісткі ў вучылішчы, выдатна танцуюць і цудоўна ўмеюць іграць на цымбалах. Дзяўчаты выдатна вучацца і перавыконваюць вучэбна-вытворчы план.

Фота А. КОГАЛЯ.

# МІЖРАЁННЫЯ ГАЗЕТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

### РЫХТУЮЦЦА ДА АГЛЯДУ ТАЛЕНТАЎ

Сёлета адбудзецца Дэкада беларускага самадзейнага мастацтва. Рыхтавацца да творчага экзамену пачалі шматлікія калектывы мастацкай самадзейнасці рэспублікі. Іх старанная праца знаходзіць шырокае адлюстраванне ў мясцовым друку.

Міжраённая газета «Зара» пры Клічаўскім тэрытарыяльным вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні ў адным з апошніх нумароў паведамляе, што ў многіх сельскіх клубах Кіраўскага раёна па-сапраўднаму ажывілася работа.

Прыкметных поспехаў дамогся Гарадзецкі сельскі клуб. Тут працуюць харавы, драматычны, танцавальны і музычны гурткі. Агітбрыгада сістэматычна ставіць канцэрты для калгаснікаў, часта выязджае ў іншыя сельгасарцелі раёна. Сёлета самадзейныя артысты паставілі 13 канцэртаў.

Міжраённая газета «Палеская праўда» пры Пінскім тэрытарыяльным вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні піша аб тым, што днямі ў Іванаўскім раёне адбыўся куставы агляд мастацкай самадзейнасці. Найбольш вызначыўся калектыў калгаса «Шлях да камунізма», якім кіруе энтузіяст культурна-асветнай работы настаўніца Стрэльнянскай школы Г. Шпакоўская. Сярод удзельнікаў—лепшыя людзі калгаса: звеннявыя Марыя Якаўчык і Вольга Пыкава, даярка Алена Ляхавец, аграном Лілія Чай, шафёр Міхаіл Калыска, механізатар Анатоль Самосік.

Харавы калектыў з уздымам праспяваў некалькі песень савецкіх кампазітараў, сярод іх: «Маякі», «За Савецкі край», «Ручнікі». З тонкім народным гумарам удзельнікі агляду выканалі славацкі танец. Яркае афармленне, багаты рэпертуар, добрае выкананне ўсіх нумароў праграмы забяспечылі калектыву першае месца ў гэтым творчым спаборніцтве.

Загадчык Кармянскага раённага аддзела культуры В. Ушаў на старонках міжраённай газеты «Авангард» Буда-Кашалёўскага тэрытарыяльнага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення расказвае, што агляд агітацыйна-мастацкіх брыгад паказаў, наколькі павысілася іх роля ў камуністычным выхаванні працоўных.

На сцэне Бычанскага сельскага клуба выступілі самадзейныя артысты з калгаса імя Леніншыскага. Вакальны ансамбль з 11 чалавек выканаў песню «Слаўся, родная старажава», а таксама беларускія народныя песні «Лянок», «Каля млына».

### КАЛГАСНЫ САВЕТ КУЛЬТУРЫ

Міжраённая газета «Прамень» пры Стаўбцоўскім тэрытарыяльным вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні ў 13 нумары за бягучы год паведамляе сваім чытачам, што па ініцыятыве настаўніка Васілаўгольскай сямігадовай школы С. Байдака ў калгасе «Беларусь» Дзяржынскага раёна створаны калгасны савет культуры. Працуе ён у цесным кантакце з праўленнем калгаса, брыгадзірамі, звеннявымі і ўсю сваю работу накіроўвае на мабілізацыю калгаснікаў на вырашэнне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. У калгасны савет культуры ўваходзяць бібліятэкар М. Малашка, дырэктар сямігадовай школы В. Тагановіч і іншыя.

Пры савеце створаны секцыі. Секцыю перадавога вопыту ўзначаліў тав. Махнач, культурна-асветную—тав. Тагановіч. Секцыя перадавога вопыту прымае актыўны ўдзел у барацьбе за якасць сяўбы і лепшы догляд пасеваў.

Раней у арцелі было дрэнна наладжана кінаабслугоўванне. Кінамеханікі бездапазна ставіліся да выканання сваіх абавязкаў. Савет культуры абмеркаваў гэта на пасяджанні, у выніку кінамеханікі сталі лепш працаваць.

Не ўсё добра было ў калгасе з пастаноўкай культурна-масавай работы. І тут савет культуры дапамог. Цяпер агітатары праводзяць гутаркі не радзей двух разоў на тыдзень. Пры клубах пачалі працаваць лекторыі. Дырэктар мясцовай школы тав. Тагановіч, напрыклад, прачытала за квартал пяць лекцый. Па ініцыятыве савета культуры вёскі Ліхачоўшчына, праведзен вечар пытанняў і адказаў па матэрыялах сакавіцкага Пленума ЦК КПСС.

Савет культуры дапамагае палітарганізатарам праводзіць масавую работу сярод калгаснікаў. Старшыня савета тав. С. Байдак, напрыклад, з'яўляецца палітарганізатарам у звяне дзевятай паляводчай брыгады і праводзіць там масава-палітычную работу сярод калгаснікаў.

### ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ АКТЫВІСТАЎ

Добрая слава ідзе на Лагойшчыне пра Аўгустоўскі клуб. Уся работа тут падпарадкавана адной мэце—каб лекцыя, гутарка памагалі працаўнікам вёскі хутчэй і лепш вырашаць пастаўленыя перад імі задачы далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі.

Душою ўсіх клубных спраў з'яўляюцца члены савета клуба. Гэта па іх ініцыятыве афармлена наглядная агітацыя, зроблены кутні агітатара, бураковода і кукурузавода, дзе можна пачытаць разнастайную літаратуру як выраслічваць гэтыя культуры. Калі ў чытача ўзнікне якое-небудзь пытанне, адказ на яго ахвотна даюць аграном Я. Войцік, старшыня сельгасарцелі імя Леніна В. Шаркоў.

Вечарамі ў клубе часта праводзяць гутаркі спецыялісты калгаснай вытворчасці. Гэта дае станоўчыя вынікі. Людзі з ахвотай наведваюць клуб, бібліятэку. Колькасць чытачоў за апошні час значна павялічылася.

Кнігу тут чытае кожны калгаснік. Добрыя кніганошы—вучні школы і камсамольцы. Свінарка Раіса Кандрашэнка прапагандуе кнігу сярод жывёлаводаў. Вучаніца сёмага класа Валя Курыленка арганізавала ў сябе дома бібліятэку, якой карыстаюцца нала 40 чалавек. Яе сяброўка Таня Дрозд загадвае бібліятэчкай-перасоўкай у вёсцы Сілічы.

У клубе арганізоўваюцца канферэнцыі чытачоў. Вечарамі збіраюцца аматары мастацкай самадзейнасці. Хутка калгасныя артысты прадэманструюць сваё майстэрства на раённым агляде мастацкай самадзейнасці.

Падрабязна аб рабоце Аўгустоўскага клуба можна прачытаць на старонках міжраённай газеты «Ленінскі шлях» пры Лагойскім тэрытарыяльным вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні.

Сапраўдны талент, як гаварыў Бялінскі, павінен «тварыць з душы, а не мудрыць розумам». За мудрагелістым вобразам губляецца сэнс:

У шилянцы ляжалі ручні,
тумкі, алоўкі.
Чарнілам яна была напоўнена.
П'яніца паднёс яе да рота
і асушыў
Усё, што трэба было аддаць сыну.

Вершы А. Наўроцкага здзіўляюць кантрасным, яркіх, упершыню адкрытых радкоў з радкамі на дзіва штукарскімі, недарэчнымі. У вершы «Пачатак» ёсць мясціна, якая запомніцца надоўга: фашысты падпалілі хату, дзе жанчына нараджае дзіця. «Абвалілася першае бервяно, і раптам дзіця закрычала. На ўсю Еўропу закрычала яно». І як не адпавядаюць гэтаму вобразу шматлікія мудраванні наконт смерці: «Старасць — халодная, слізкая жаба — мяне падпільнуе, схопіць і... цалаваць пачне».

Ад некаторых радкоў і вобразаў, кажучы словамі паэта, «прыемна і балюча, як ад снегу, які папаў за каўнер». Нечаканым паваротам і свежасцю ўразіць смелы вобраз: «Так лёгка натруджанай маёй спіне, нібы я нясу не ношу з сынам, а сын разам з ношай нясе мяне» (верш «Другу»). І раптам— такія «клінічныя» радкі, за якія толькі балюча: «Перад сном цалую сваю маладзіцу, каб грыпам не заразіцца, прыкрываю губы марляй, складзенай у пяць столак». У такім жа перабольшана натуралістычным плане цалкам напісан верш «Яйка». З гіпербалізацыяй у першых радках яшчэ можна пагадзіцца. Увасабляецца ж страшэнны голад: «У жываце пераварыцца і кавалак крэсла, і гайка». Але дзеля якой мэты пісаліся далей аголена-натуралістычныя радкі пра яечка («Трэснула. Пацякло. Эй, рот загружай!»... «Сліны сок пацёк») — каб сцвердзіць, што «вось гэта і ёсць рай на зямлі!»?!

Нейкай клінічнасцю патыхае і ад такіх радкоў: «Немец хацеў панюхаць чабару, якім багаты нашы лясы. Мы яму падсабілі і шабляй зрабілі з аднаго — два насы». Або: «Хай нос каго выпнецца — адсячом».

«У кожнага мастацтва, — запісаў у сваім дзённіку Леў Мікалаевіч Талстой,—ёсць два адступленні ад шляху: пошласць і штучнасць. Паміж абодвума толькі вузкі шлях. І вузкі шлях гэты вызначаецца парывам. Ёсць парыў і кірунак, то мінеш абедзве небяспекі». І праўда: скрозь, дзе толькі творчы парыў падмяняецца фантазіяй ад розуму, арыгінальнічаннем, паэт паддаецца штучнасці, а то і пошласці. Поруч з добрымі вершамі, з цудоўнымі радкамі раптам спатыкаешся на такія правалы густу:

Я страшэнна мух не люблю.
Перад тым, як легчы спаць,
іх лаўлю
І запіхаю ў нос: усё роўна
яны туды залазяць.
Дык я рашыў іх сам запіхваць.

Не верыцца проста, што гэта той жа самы паэт— аўтар вершаў «Рукі», «Па Акмоліскім стэпе», «Размова з Уладзімірам Ільічом», «Пачатак», «Чатырохгранная ваза». Адчуванне слова, меру перабольшвання, такт, густ А. Наўроцкі траціць і ў некаторых вершах, асабліва ў сваіх дзесяці элегіях. Чаго варта, напрыклад, такая гіпербалізацыя: хлопец асмеліўся пацалаваць дзявочую руку, і раптам «з-пад аднаго пазногця выпаў кавалак бруду і ўпаў на белага гусака, які церся ля іх ног, — белы гусак адышоў чорным. Не верыце, прыйдзіце, глядзіце, вунь ён пасецца на лузе». Што гэта— нясціплы жарт ці паэзія ўсур'ёз? Мусіць жа, усур'ёз, калі трапіла на старонкі кніжкі.

Бясспрэчна, тут вінаваты і рэдактар В. Сёмуха, які, рыхтуючы кніжку да друку, прыняў агулам усё, што здаў аўтар. Але дзе ж патрабавальнасць самога аўтара? А можа малады паэт проста не здолеў разабрацца, што ў яго вершах добрае, а што дрэннае? Шчыра скажам: у яго не хапіла павагі ні да чытача, ні да сябе, ні да тых старэйшых таварышаў, якія з добразычлівасцю дапамагалі яму разабрацца ў вершах, што ён прыносіў у рэдакцыі. У прыватнасці, усе элегіі з іх «мухамі» і «брудам» былі адхілены рэдакцыяй часопіса «Полымя», як творы безгустоўныя, з фальшам. І вось малады паэт як бы дэманстратыўна ўключыў іх у свой зборнік, ніколькі не палічыўшыся з думкай вопытных майстроў слова.

А разгорнем, напрыклад, чацвёрты нумар гэтага часопіса, дзе змешчана нізка вершаў паэта. Параўнайце іх з вершамі, уключанымі ў кніжку, і вы адразу заўважыце, што паэт наўмысна аднавіў усё, вяртаючыся да сваіх першых, куды горшых варыянтаў. Напрыклад, у часопісным варыянце верша «Размова з Уладзімірам Ільічом» ёсць такі радок: «Адзін селянін бачыў Вас на станцыі Дно». У кніжцы ж замест слова **селянін — калгаснік**, так, як было ў першым варыянце. А гэта ж грубае змяшчэнне планаў, бо ніякіх калгаснікаў у той час яшчэ не было.

А параўнайце, які лепшы з наступных варыянтаў: у кніжцы — «Уладзімір Ільіч, нас — мільярд. Хай нос каго выпнецца — адсячом. Гарыць світанне нашага дня», а вось як у часопісе: «Уладзімір Ільіч, нас мільярд. Знішчым, як з бомбай хто выпнецца. Не спыніць світанне нашага дня». У кніжцы захаваны ўсе моўныя і стылістычныя шурпатасці, якія засмечваюць добры верш.

Чытаючы па часопісу верш «Адгабляваная дошка», таксама бачыш, што гэты варыянт лепшы чым у кніжцы. Вось адна толькі мясціна: у часопісе— «Добры пах смалісты, пах такі, што, здаецца: ім бы толькі жыў і дыхаў», у кніжцы: «А пах твой такі, што, здаецца, ім толькі б жыў і дыхаў, дыхаў і жыў». Аўтар, як, бачым, застаўся верным сваёй мудрагелістасці і ўзнавіў яе.

У паэта ёсць шчырае жаданне:

Да сэрца людскога—прыстані—
Падплываць
Караблямі паэм...

Але ж для гэтага трэба мець, нібы той компас, выверанны густ, тонкае адчуванне мастацкага слова, каб пазбегнуць на шляху «падводных камняў» і не садзіцца на мель. Трэба выхоўваць свой паэтычны талент.

У Мінску праходзяць гастролі Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола. На здымку сцэна са спектакля «Чамадан з наклейкамі». У ролях Ларысы — артыстка Наталля Кузьміна, Юрыя Куніцына — артыст Міхаіл Дзяржавін.

# БАЕЦ, ПІСЬМЕННІК

На газетных палосах зноў знаёмыя назвы — Мадрыд, Більбао, Уэска... Па іспанскай зямлі пракаціўся грозны вал забастовак. Зноў астурыйскія шахцёры і металургі Більбао заявілі аб сабе. Зноў вясною, зноў улетку...

Дваццаць пяць гадоў назад, такім жа яркім летнім днём, пад Уэскай фашысцкі снарад спыніў жыццё чалавека, якога ўся сумленная Іспанія ведала як бясстрашнага камандзіра 12-й інтэрнацыянальнай брыгады — генерала Лукача. Салдаты гэтай брыгады гаварылі амаль на дваццаці мовах свету.

Генерал Лукач загінуў пад Уэскай, а пахавалі яго ў Валенсіі. Курганом кветак упрыгожыла магілу рэспубліканская Іспанія. Сведкі той горкай пары ўспамінаюць, што па генералу Лукачу — венгерскім рэвалюцыянеры, пісьменніку Матэ Залка — Валенсія плакала тры дні і тры ночы.

З таго часу мінула дваццаць пяць гадоў. Імя генерала Лукача парадніла з бяссмерцем. На дзесятках моў разышліся па свеце яго чыстыя, светлыя кнігі. Свабодная Венгрыя ўшаноўвае памяць герояў: яго імя носяць фабрыкі і вуліцы, магазіны і афіцэрскія вучылішчы, спартыўныя клубы і студэнцкія інтэрнаты.

Матэ Залка многія гады пражыў у Маскве. І тут, на вуліцы Фурманава, на сцяне дома, трыццаць з лішнім гадоў назад пабудаванага пісьменніцкім жыллёвым кааператывам, вісіць цяпер строгая мармуровая дошка з надпісам: «У гэтым доме ў 1932—36 гадах жыў і працаваў пісьменнік Матэ Залка».

Жыў і працаваў... Гэта традыцыйнае ў падобных выпадках выказванне цяжка ўспрымаецца ў мінулым часе.

Мы наведалі кватэру Матэ Залка. Удава пісьменніка і генерала — Вера Залка любоўна знаёміла нас з тым, што яна нехаця называе хатнім музеем Матэ Залка. Нехаця, бо ўсё яго жыццё, усё, што ён рабіў і пісаў, процістаіць музейнаму, ціхаму, спакойнаму.

Вера Залка паказвае невялікі аматарскі здымак.

— Вось тут Залка — у Парыжы: ён здымаўся перад тым, як з'явіўся ў Іспаніі... З Масквы Матэ выехаў раптоўна. Да самай апошняй хвіліны — ні мне, ні дачцы нічога не казаў. А потым усё ж сказаў, папрасіўшы, каб мы памаглі яму добрым настроем... На Ленінградскім вакзале, калі Матэ сеў у вагон, мы ўсміхаліся. І ён таксама. Такім мы яго бачылі ў апошні раз.

У кватэры сям'і Матэ Залка захоўваецца значны архіў. Вялікая кладоўка ад падлогі і амаль да столі занята акуратна складзенымі справамі і папкамі... Колькі гадоў працы, цярплівасці і настойлівасці трэба было патраціць, каб сабраць пісьмы і рукапісы Матэ Залка, чарнавікі яго сцэнарыяў, фрагменты будучых раманаў, паспешліва напісаныя мініяцюры... Бяру наўздагад адну з папак.

— Тут захоўваецца ўсё, што звязана з кінасцэнарыем пра Дзяржынскага, — тлумачыць Вера Залка. — Бо Матэ доўгія гады быў захоплены думкаю аб фільме, прысвечаным Дзяржынскаму.

Гартаю даўно кранутыя часам лісты, напісаныя па-руску і венгерску накіды будучага сцэнарыя. Вось выпіскі з біяграфіі Дзяржынскага, датаваныя маем 1935 года, пісьмы ў дырэкцыю кінастудыі «Белдзяржкіно»:

«...Фігура Фелікса Эдмундавіча, гэтага рыцара нашай рэвалюцыі, не можа не хваляваць савецкага пісьменніка. На гэтую тэму ўжо напісаны рад твораў, і не выпадкова, што гэта — рэчы з галіны паэзіі (Маякоўскі, Безыменскі, Жараў і інш.). Але я павінен напісаць рэч, якая павінна легчы ў аснову аднаго з самых рэалістычных відаў мастацтва — кіно. У гэтым цяжкасць. Але якраз гэтая цяжкасць зробіць работу па-бальшавіцку ганаровай...»

Гэтай задуме, на жаль, не суджана было здзейсніцца.

Знаёмімся з іншымі рукапісамі. Іх многа, вельмі многа, хоць тут, на маскоўскай кватэры Матэ Залка, па словах яго жонкі, захоўваецца, магчыма, толькі трэцяя ці чацвёртая частка архіва пісьменніка... Вось распрацоўка сцэнарыя дзіцячага фільма «Мышыная рука», камедыя ў пяці дзеях «Кукарэку», накіды, аб'яднаныя агульным загалоўкам «Ударнікі». Гэта вельмі цікавы рукапіс. Матэ Залка, які пільна вывучаў навакольнае савецкае жыццё, задумаў напісаць сцэнарый пра свайго сучасніка. Яго хваляваў душэўны свет савецкага чалавека, пра якога, на думку Матэ Залка, нельга пісаць шумна і траскуча:

«Пасядзім ціха, — чытаем у адным з накідаў, — давайце не шумець. Трэба пагаварыць, трэба падумаць засяроджана. Нельга падысці да гэтага пытання мітуслива, з наскоку, бо ідзе гаворка пра савецкага, ды і не проста савецкага, а перадавога савецкага чалавека...»

... Так, дзіўна адчуваеш сябе, гартаючы трыццацігадовай даўнасці сшыткі, пісьмы Матэ Залка. Усё гэта напісана даўным даўно, самае малое 25—30 гадоў назад. І ўсё гэта ці ва ўсякім выпадку вельмі многае з таго, што рупліва захоўваецца ў кватэры пісьменніка на вуліцы Фурманава ў Маскве, вытрымала выпрабаванне часам.

Вось пісьмы хлопцаў з палтаўскай вёскі Белікі, што прыйшлі зусім нядаўна на імя Веры Залка. У іх просьба апісаць маскоўскі першамайскі парад і ўвогуле ўсё свята, «бо ў нас, у Беліках, це свято було чудове!» — паведамляюць хлопцы. І Вера Залка адказвае сваім сябрам, сябрам Матэ Залка, пра ўсё, што яны просяць, хоць, вядома, юныя палтаўскія карэспандэнты ніколі не бачылі Залка. Але ў іх ёсць сваё права пісаць менавіта ў гэты маскоўскі дом.

Справа ў тым, што Матэ Залка ў трыццатыя гады пяць год запар ездзіў у Белікі — адпачываць, працаваць, пісаць.

— Вядома, хутка ў яго ў вёсцы з'явіліся сябры, якія ішлі да Матэ за парадаю, запрашалі на рыбалку і ўвогуле не гулялі без яго вяселляў, не рабілі заручын,—успамінае Вера Залка.— Пра Белікі ён памятаў заўсёды, нават у Іспаніі... І вось нядаўна ў Беліках адкрыўся музей Матэ Залка. Я адвезла туды фатаграфіі, кнігі, рэчы і не здзівілася, калі ўбачыла, як шмат людзей добра памятаюць і горача любяць яго. Так што Белікі для нашай сям'і такое ж роднае месца, як Масква, Більбао ці, скажам, венгерская вёска Маталч, дзе Матэ нарадзіўся...

Маталч, Будапешт... І яны нябачнымі, але вельмі моцнымі ніткамі звязаны з гэтым маскоўскім домам. Шмат разоў удава пісьменніка і яе дачка — цяпер рэжысёр — па запрашэнню венгерскіх таварышаў ездзілі на радзіму мужа і бацькі. Вось і цяпер яны зноў запрошаны ў Будапешт. З Венгрыі ў Маскву заўсёды прыходзіць мноства пісем. Іх пішуць гісторыкі, раманісты, архітэктары і проста сябры маленства пісьменніка, таварышы па барацьбе ў Іспаніі. Сярод іх, між іншым, ёсць і кавалеры ўстаноўленага ў Венгрыі ордэна Матэ Залка, якім адзначаюцца подзвігі ў імя народнай, сацыялістычнай Венгрыі.

... Некалькі гадзін працягвалася гэтая незабыўная размова ў маскоўскай кватэры Матэ Залка. Я гартаў рукапісы, узіраўся ў выцвілыя фатаграфіі, чытаў вясёлыя запіскі і асцярожна разгладжваў запаветныя лісточкі пісем з Іспаніі. Вось яно, апошняе, напісанае за шэсць дзён да гібелі, пісьмо да жонкі. Матэ Залка паведаміў, што атрымаў з Масквы адразу два пісьмы і шчаслівы, вельмі сумуе па сям'і...

«... Трэба знайсці ў сабе сілы перамагчы гэта. Галоўнае тое, каб быць верным сынам краіны, перад якой схіляюцца нават заклятыя ворагі... Калі я вельмі стамлюся, калі пасля цяжкага дня, пасля таго, як змаўкаюць нашы гучныя галасы, адчуваю, што няма больш сіл, варта толькі падумаць пра тое, што я ж з той краіны, як робіцца мне соромна, і сілы прыходзяць».

Такім было апошняе пісьмо Матэ Залка дадому з рэспубліканскай Іспаніі.

**Павел ЯУСЕЕЎ,**
**карэспандэнт АДН.**

# ЯГО ЗБРОЯЙ БЫЎ СМЕХ

**У сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня смерці румынскага пісьменніка Іона Лукі Караджале ў Румынскай Народнай Рэспубліцы з 30 мая па 10 чэрвеня праводзіліся вялікія нацыянальныя ўрачыстасці. Па рашэнню Сусветнага Савету Міру гадавіна з дня смерці выдатнага драматурга-сатырыка адзначаецца ўсім прагрэсіўным чалавецтвам.**

Іон Лука Караджале з'яўляецца самым выдатным румынскім драматургам і адным з буйнейшых прадстаўнікоў еўрапейскага крытычнага рэалізму. Апошнія два-тры дзесяцігоддзі прынеслі яму сусветную вядомасць. Імя Караджале па праву займае пачэснае месца сярод імён буйнейшых пісьменнікаў-сатырыкаў свету — Плаўта, Гальдоні, Мальера, Гогаля, Чэхава, Твэна, Шоу. Шэдэўр драматургіі Іона Лукі Караджале — камедыя «Згубленае пісьмо» — уключаўся ў рэпертуар тэатраў Еўропы, Амерыкі і Азіі. У Маскве, Парыжы, Берліне, Варшаве, Пекіне, Каіры, Буэнас-Айрэсе, Токіо гледачы апладзіравалі вострым рэплікам п'есы, яе іскрыстаму гумару, здольнасці аўтара раскрываць сутнасць сацыяльных з'яў, характэрных для буржуазна-памешчыцкай Румыніі.

«Гэты чалавек, хоць зарэж яго, не гаварыў таго, чаго не думаў», — так пісаў пра Караджале пісьменнік Іон Славіч. А сам Караджале гаварыў: «Я або маўчу і пасмейваюся або так здзекваюся з іх, каб яны самі смяяліся з сябе». «Так ён і рабіў, — працягвае Славіч, — і яны смяяліся, смяюцца і яшчэ доўга будуць смяяцца перад люстэркам, якое ён ім падставіў пад самы нос». І з-за гэтага смеху, які асуджае несумленнасць, подласць, распусту і грубасць буржуазіі, як і яе прагну нажывы, Караджале з самага пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці наклікаў на сябе лютую нянавісць правячых класаў. Ён становіцца народным трыбунам, публічным абвінаваўцам ворагаў народа, змагаром за інтарэсы тых, «хто прадстаўляе ўсіх». Непрымірымы ў сваёй барацьбе, настойлівы і суровы, Караджале заўсёды быў блізкі свайму народу. Таму яго творчасць была і застаецца дагэтуль жыццёвай.

Што значыў Караджале для гісторыі румынскай літаратуры? Чаму яго імя, яго творчасць жыве і сёння, як адна з самых яркіх праяў нацыянальнага генія? Караджале ўзняў румынскі тэатр да вяршынь дасканаласці. Толькі пры І. Л. Караджале румынская камедыя і драма дасягаюць еталасці. Асноўным для яго творчасці была сатыра. Па свайму светапогляду, па духоўнаму ладу творчасці Караджале быў блізкі да Гогаля і Чэхава. Першым моцным і яркім праяўленнем яго таленту была камедыя «Бурная ноч» (1878), якая высмейвала норавы тупой, але напышлівай дробнай буржуазіі. Пасля «Бурнай ночы» Караджале даў румынскай літаратуры новую сатырычную камедыю — «Згубленае пісьмо» (1884). Дзеянне п'есы адбываецца ў правінцыяльным горадзе ў дні падрыхтоўкі да выбараў. Лідэр правячай партыі Захарыя Траханаке — несумленны і вузкалобы маньяк; прэфект Штэфан Ціпатэску — спрытны, які карыстаецца любымі шляхамі, каб толькі ўзняцца яшчэ на адну ступеньку на службовай лесвіцы; апазіцыянер Нае Кацавенку — тып заўзятага дэмагога. Урэшце ўся гэтая барацьба паміж партыямі заканчваецца прымірэннем: суперніцтва паміж гэтымі людзьмі — гэта толькі пагоня за нажывай. Трэцяя п'еса Караджале напісана на матэрыяле сялянскага жыцця. «Напасць» — гэта драма, народжаная трагічнай барацьбой жанчыны з несправядлівасцю. Гэтую драму дапаўняюць некалькі аповесцей, напісаных таксама на матэрыяле вёскі. Кожны, хто з любоўю і цікавасцю прачытае творы Караджале, знойдзе ў іх саркастычную ноту, а побач з ёй і другую, глыбокую, суровую ноту душэўнага болю, скрозь які праглядвае часам то непрымірымая нянавісць, то ледзь стрыманыя слёзы.

Тыпы Караджале, намаляваныя з дапамогай гранічна сціслай і крыштальна чыстай фразы, сталі настолькі папулярнымі, што нібы вызначаюць цэлую сацыяльную ці палітычную катэгорыю. Ні адзін румынскі пісьменнік не даў айчыннай літаратуры столькі характэрных смешных і непажаданых тыпаў, як Іон Лука Караджале.

«Вось вы якія!» — сказаў Караджале тым, хто распараджаўся ў той час лёсам румынскага народа. Гэтак жа, як Гогаль у Расіі, Караджале ў Румыніі, бічуючы рэчаіснасць буржуазіі і памешчыкаў, паказвае «жывую рэчаіснасць» (як ён называе яе), што хадзіла тады ў зрэб'і, і жабравала, і прадбачыць цудоўную будучыню краіны, якой можна дабіцца барацьбой народа.

Румынскі народ на чале з рабочым класам і сваёй партыяй пасля вызвалення краіны заклаў моцныя асновы для ажыццяўлення гэтай мары.

Творчасць Іона Лукі Караджале — краса і гонар культурнай спадчыны Румыніі. У ёй румынскі народ бачыць бязлітасную зброю, накіраваную супраць сваіх ворагаў. Творчасць Караджале ўзвышае і ўмацоўвае баявое адзінства працоўных Румыніі, стваральнікаў вялікіх сацыялістычных будоўляў, служыць справе барацьбы за абарону культуры і чалавечага прагрэсу, справе барацьбы за мір.

Сусветны Савет Міру рэкамендаваў адзначыць яніцдзесяцігоддзе з дня смерці Іона Лукі Караджале, аднаго з вялікіх майстроў сусветнай літаратуры Гэта заслужанае прызнанне гуманістычных і прагрэсіўных запаветаў яго бессмяротнай творчасці.

# С. С. Бірукоў

Адышоў з жыцця народны артыст РСФСР Сяргей Сяргеевіч Бірукоў — выдатны чалавек, таленавіты акцёр і педагог.

Пачаўшы свой творчы шлях у 1923 г. у Кастрамскім драматычным тэатры, Сяргей Сяргеевіч да апошніх дзён жыцця горача и шчодра аддаваў сябе любімай справе.

Творчае жыццё Сяргея Сяргеевіча было звязана з тэатрамі гарадоў Іванава, Яраслаўля, Уладзівастока, Новасібірска, Мінска.

У новасібірскім тэатры «Чырвоны факел» Сяргей Сяргеевіч прапрацаваў 28 год. Ім створаны ролі: Забеліна («Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна), Дорна («Чайка» А. Чэхава), Фамы Апіскіна («Сяло Сцяпанчыкава» па раману Ф. Дастаеўскага), Каламійцава («Апошнія» М. Горкага), Карэніна («Анна Карэніна» Л. Талстога) і іншыя.

Апошнія гады Сяргей Сяргеевіч працаваў у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага. Усе памятаюць яго яркія сцэнічныя вобразы: Дора («Дванаццатая гадзіна» А. Арбузава), Кнурава («Беспасажніца» А. Астроўскага), святчэнніка («Мамаша Кураж» Б. Брэхта).

На працягу многіх год Сяргей Сяргеевіч займаўся педагагічнай працай, выхоўваючы ў будучых акцёрах і рэжысёрах якасці новага чалавека — мастака высокай культуры.

У 1947 годзе Сяргей Сяргеевіч Бірукоў уступіў у рады Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Творчасць яго высока ацэнена ўрадам і народам. У 1953 годзе яму было прысвоена званне Заслужанага артыста РСФСР, а ў 1957 годзе — званне Народнага артыста РСФСР. Ён узнагароджан ордэнам «Знак пашаны» і медалем «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне».

Сяргей Сяргеевіч быў чалавекам надзвычай прывабным, нястомнай энергіі, чулым таварышам.

Светлы вобраз Сяргея Сяргеевіча Бірукова назаўсёды застанецца ў памяці ўсіх, хто яго ведаў.

**Міністэрства культуры БССР**
**Беларускае тэатральнае таварыства**
**Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага**
**Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы**
**Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут**
**Сваякі, блізкія, таварышы.**

**Міністэрства культуры БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці народнага артыста РСФСР Сяргея Сяргеевіча БІРУКОВА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.**

**Беларускае тэатральнае таварыства з глыбокім жалем паведамляе аб смерці народнага артыста РСФСР Сяргея Сяргеевіча БІРУКОВА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.**

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута глыбока смуткуе з прычыны раптоўнай смерці выкладчыка інстытута народнага артыста РСФСР Сяргея Сяргеевіча БІРУКОВА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.**

**Калектыў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага смуткуе з поваду раптоўнай смерці народнага артыста РСФСР Сяргея Сяргеевіча БІРУКОВА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.**

**Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР смуткуе з прычыны смерці артыста Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя А. М. Горкага народнага артыста РСФСР БІРУКОВА Сяргея Сяргеевіча і выказвае глыбокае спачуванне яго сям'і і блізкім.**

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы смуткуе з прычыны раптоўнай смерці народнага артыста РСФСР Сяргея Сяргеевіча БІРУКОВА і выказвае глыбокае спачуванне сям'і памёршага і калектыву Рускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.**

**Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю Астапенку з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці маці.**

# У НАШЫХ СЯБРОЎ

## «Белавочка» ў Карлавых Варах

Пасольства Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам у Маскве наладзіла днямі прагляд сваіх нацыянальных фільмаў, якія будуць паказаны ў чэхаславацкім курортным горадзе Карлавы Вары, дзе 10 чэрвеня адкрыўся традыцыйны Міжнародны фестываль.

Маладыя майстры в'етнамскага экрана вязуць на суд сусветнай кінакрытыкі свае фільмы, выпушчаныя некалькі месяцаў назад,— «Белавочка» і «Яны перамаглі». Думаецца, што гэтыя карціны, таксама як і невялікая кінаанавела «Два салдаты», будуць мець поспех усюды, нават у самых строгіх цаніцеляў. У кожным з гэтых фільмаў захапляе праўдзівасць, глыбокі псіхалагізм, лірычная і тонкая ігра акцёраў.

...Гэта адбылося ў адным з акупіраваных раёнаў Паўднёвага В'етнама ў час вайны Супраціўлення. У саламянай хаціне ля паўзабытай рачной пераправы жыве лодачнік са сваёю дачкой— ласкавай і вясёлай Нга. Ён даўно ўжо стаў сувязным падпольшчыкаў з руху Супраціўлення. Калі на пераправе спакойна, стары лодачнік узнімае высока ў неба папяровага змея, гэта значыць, што партызаны могуць смела дзейнічаць у навакольных вёсках.

Аднойчы раніцаю некалькі пераапранутых салдат на чале з амерыканскім інструктарам захопліваюць пераправу. Яны звязваюць старога і наладжваюць засаду. Нга спрабуе пусціць змея, але таксама трапляе ў лапы карнікаў.

Вось на тым беразе з'явіліся партызаны. Яны чакаюць лодкі. Пагрозамі забіць бацьку бандыцкі верхавод прымушае Нга весела скакаць з вяровачкай — няхай у партызан не будзе ніякіх падазрэнняў. А лодка з пераапранутымі салдатамі ўсё ближэй і ближэй падплывае да гэтага берагу.

Дзяўчынка скача, а ў вачах яе роспач: яшчэ некалькі разоў махнуць вяслом партызаны і апынуцца ў пастцы. Нга кідаецца да ракі і гучна крычыць:

— Тут ворагі! Не сядайце ў лодку!

Чарга з амерыканскага аўтамата здаганяе яе ля самай вады. Так заканчваюць свой расказ таленавітыя майстры кіно — рэжысёр Нгуен Ван Тхонг і аператар Нгуен Данг Бау.

Большасць фільмаў, створаных Ханойскай кінастудыяй, прысвечаны вайне Супраціўлення, а таксама сённяшняй барацьбе паўднёва-в'етнамскіх братоў з праамерыканскім крывавым дзьемаўскім рэжымам.

Трывожныя, змрочныя весткі штодзённа прыходзяць з-за семнаццатай паралелі.

У гарадах Паўднёвага В'етнама штодзённа можна бачыць жахлівыя сцэны. Нядаўна ў Жыа-Дзіне апранутая ў рызэ жанчына напала на гандлярку і хацела адабраць у яе кашалёк. Паліцыя арыштавала жанчыну і патрабавала сказаць, хто яе паслаў. Тады яна павяла паліцэйскіх ва ўбогую трушчобу, дзе на бамбукавым ложку ляжалі яе трое цяжка хворых дзяцей, а яшчэ чацвёра галодных дзяцей сядзелі на падлозе.

«Вось хто мяне паслаў, — сказала няшчасная маці паліцэйскім, — арыштуйце іх, калі хочаце!»

Які пісьменнік, мастак ці майстар кіно можа застацца абыякавым да пакут свайго народа? Вось каму маладая кінематаграфія Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам узнімае свой голас на абарону абяздоленых братоў на поўдні краіны. Яна кліча да бязлітаснай барацьбы з амерыканскімі захопнікамі і з іх паслугачамі — дзьемаўскай клікай.

**І. МЕЛЬНІКАЎ,**
**АДН.**

## Стагоддзе Нацыянальнага музея

Споўнілася сто год з дня заснавання ў Варшаве Нацыянальнага музея. З выпадку юбілею старэйшыя супрацоўнікі музея былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. А вось кароткая гісторыя музея.

Першай калекцыяй Нацыянальнага музея была карцінная галерэя Школы прыгожых мастацтваў і галерэя копій у гіпсе (уласнасць апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага). Пазней першы дырэктар Нацыянальнага музея Карніцкі значна папоўніў калекцыю музея, удала купіўшы шмат карцін на аукцыёне ў Кёльне, сярод якіх знаходзіліся палотны Пінцірык'р, Гарданса, Т'епала і інш.

Экспанаты музея паступова папаўняліся галоўным чынам з прыватных калекцый.

У 1921 г. аддзел гісторыі польскага ваеннага мастацтва быў выдзелены і ператвораны ў Ваенны музей, а ў 1932 г. у двух першых павільёнах новага будынка адкрыты аддзел прыкладнога мастацтва. У 1937 г. — аддзел антычнага мастацтва на базе матэрыялаў, атрыманых у Егіпце ў час раскопак пад кіраўніцтвам праф. К. Міхалоўскага.

Цяпер калекцыя музея значна большая, чым даваенная. За мінулыя 17 год Нацыянальны музей арганізаваў каля 200 выставак польскага і зарубежнага мастацтва.

З прычыны 100-годдзя Нацыянальнага музея ў Варшаве была адкрыта юбілейная выстаўка «Мастацтва Варшавы і Мазовіі ад сярэдневякоўя да сярэдзіны XX стагоддзя».

## Мангольская літаратура — людзям

Яшчэ на другім з'ездзе Саюза мангольскіх пісьменнікаў у 1957 годзе піянеры падарылі дзеячам нацыянальнай літаратуры кніжную шафу, зробленую сваімі рукамі, і прасілі іх да наступнага з'езда напоўніць шафу ўласнымі кнігамі для юных чытачоў.

Пажаданні піянераў былі больш чым актуальныя: мангольскія літаратары пісалі вельмі мала кніг для дзяцей.

— Не меншыя прэтэнзіі да пісьменнікаў маглі прад'явіць тады студэнты і рабочыя, араты і воіны, наогул усе чытачы,—сказаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС сакратар Саюза народных пісьменнікаў С. Эрдэнэ.—У нас амаль не было буйных работ, большасць пісьменнікаў абмяжоўвалі сваю творчасць невялікімі апавяданнямі, вершамі, прысвечанымі пераважна ўслаўленню Чойбалсана і раскрыццю дробных тэм.

— XX з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які аднавіў ленінскія нормы жыцця,—працягваў С. Эрдэнэ,—выклікаў бурнае развіццё нацыянальнай літаратуры. З'явіліся дзесяткі раманаў і аповесцей, паэм, драм і апавяданняў. Вялікай падзеяй у Манголіі з'явілася апублікаванне гістарычных раманаў «Смутны час» Д. Намдага і «Лавіна з гор» Л. Тудэва, якія расказваюць аб зараджэнні рабочага руху і першых перамогах працоўнага арацтва.

З няменшай цікавасцю сустрэлі мангольскія чытачы эпічны раман «Светлы Мацір», у якім вядомы пісьменнік Ч. Ладайдамба апісвае народны рух за новае жыццё, барацьбу з ламаізмам за розумы людзей у перыяд з 1916 па 1936 год.

Як паведаміў С. Эрдэнэ, за час паміж другім і трэцім з'ездамі Саюза мангольскіх пісьменнікаў на кніжных паліцах з'явіліся кнігі 164 назваў, а пісьменніцкія рады папоўніліся многімі таленавітымі паэтамі і празаікамі. Паэмы «Лёс чалавека», «Рэвалюцыя», «Абуджэнне цаліны» Ц. Гайтава, а таксама «Тры суседы» С. Дашдэндэва, «Світанне над стэпам» Д. Пурэўдоржа і многія іншыя заваявалі вялікую папулярнасць у рэспубліцы і не толькі сваёй надзённасцю, але і высокімі мастацкімі якасцямі.

Пра далейшы рост майстэрства мангольскіх літаратараў сведчаць таксама апавяданні апошніх гадоў і кнігі для дзяцей. Пісьменнікі Б. Баст, Ч. Чымід, Ч. Ладайдамба і іншыя ў сваіх невялікіх апавяданнях малююць выдатныя вобразы, узнімаюць актуальныя тэмы, з вялікім майстэрствам раскрываюць унутраны свет сваіх герояў, іх псіхалагічныя перажыванні.

— На трэцім з'ездзе ЦК МНРП заклікаў нашых літаратараў, — сказаў у заключэнне гутаркі С. Эрдэнэ, — смялей умешвацца ў жыццё, больш пісаць пра сучаснікаў — будаўнікоў сацыялістычнага грамадства, заўсёды ўдасканальваць сваё майстэрства, больш поўна выкарыстоўваючы багацці роднай мовы. Я перакананы, што нашы пісьменнікі выканаюць наказ сваёй партыі, дадуць свайму народу творы, вартыя нашага часу.

**Васіль ПЯТРЭНКА,**
**карэспандэнт ТАСС.**

## Музей Бажэны Нямцовай

Музей выдатнай чэхаславацкай пісьменніцы Бажэны Нямцовай адкрыўся днямі ў горадзе Чэшска-Скаліцэ. Тут пісьменніца правяла сваё дзяцінства і юнацтва. Адкрыццём музея закончыліся памятныя дні, прысвечаныя 50-годдзю з дня смерці Нямцовай.

Як вядома, юбілей выдатнай дачкі чэхаславацкага народа быў уключаны ЮНЕСКО ў спіс сусветных культурных гадавін.

НА НЁМАНЕ У ГРОДНА. Фота А. ДЗІТЛАВА.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. | Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарова, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры— 3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03 | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 12140